МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

ЭКАЛАГІЧНЫЯ ЎМОВЫ ЎТРЫМАННЯ ПАЛІТЫЧНЫХ ЗНЯВОЛЕНЫХ У БЕЛАРУСІ

Даследчы даклад

© Міжнародны камітэт па расследаванні катаванняў у Беларусі
2026



Змест

1. Уводзіны 7

2. Метадалогія і абмежаванні даследавання 9

3. Дзве даследаваныя пляцоўкі 12

3.1. ПК-4, Гомель 13
3.2. ПК-1, Наваполацк 15

4. Нарматыўная рамка: міжнародныя і нацыянальныя дакументы 16

5. Вынікі: эмпірычны аналіз 21

5.1. Паветра 22
5.2. Санітарыя 30
5.3. Якасць вады 37
5.4. Уразлівасць здароўя 42
5.5. Інфраструктурныя праблемы 45
5.6. Гатоўнасць да бедстваў і рэагаванне 52
5.7. Успрыманне экалагічнай павесткі і «экалагічнае грамадзянства» (environmental citizenship) 54

6. Высновы і юрыдычная кваліфікацыя 56

7. Рэкамендацыі 60

8. Напрамкі далейшых даследаванняў 61

Дадатак. Агляд літаратуры і міжнародны кантэкст 62

Спіс скарачэнняў

ПК	—	папраўчая калонія
СІЗА	—	следчы ізалятар
КВК	—	Крымінальна-выканаўчы кодэкс Рэспублікі Беларусь
ПУР	—	Правілы ўнутранага распарадку
МКЧК	—	Міжнародны камітэт Чырвонага Крыжа
ТКП	—	тэхнічны кодэкс установіўленай практыкі
СанПіН	—	санітарныя нормы і правілы
ОНУВ	—	вызначаны на нацыянальным узроўні ўклад
UNICRI	—	Міжрэгіянальны навукова-даследчы інстытут ААН па пытаннях злачыннасці і правасуддзя
PRI	—	Penal Reform International
CO	—	аксід вугляроду
SO_2	—	дыяксід серы
NO_2	—	дыяксід азоту
ТЧ10 (PM10)	—	узважаныя цвёрдыя часціцы дыяметрам да 10 мкм
ГДК	—	гранічна дапушчальная канцэнтрацыя

Рэзюмэ

Гэты даклад дакументуе экалагічныя ўмовы ўтрымання ў дзвюх папраўчых калоніях Беларусі: ПК-4 у Гомелі, жаночай калоніі, і ПК-1 у Наваполацку, мужчынскай калоніі, — і супастаўляе іх з нацыянальнымі і міжнароднымі нормамі. Даследаванне грунтуецца на корпусе інтэрв'ю з былымі палітычнымі зняволенымі і дапоўнена незалежнымі дакладамі праваабарончых арганізацый і афіцыйнымі дзяржаўнымі данымі.

Праблема

Пенітэнцыярныя ўстановы традыцыйна аналізуюцца праз прызму бяспекі і пакарання, у той час як іх экалагічнае вымярэнне, уключаючы якасць паветра і вады, санітарныя ўмовы і тэмпературны рэжым, застаецца на перыферыі як праваабарончых, так і акадэмічных даследаванняў.

У беларускім кантэксце гэтая праблема мае дадатковае вымярэнне. Задакументаваныя сведчанні ўказваюць на тое, што неспрыяльныя ўмовы ўтрымання могуць быць не толькі наступствам агульнай неэфектыўнасці пенітэнцыярнай сістэмы, але і выбарачна выкарыстоўвацца як інструмент ціску на палітычных зняволеных.

Метад

Кожны тэматычны блок даследавання, уключаючы паветра, санітарыю, ваду, здароўе, інфраструктуру і гатоўнасць да бедстваў, па магчымасці супастаўляецца з дзвюма групамі нормаў: нацыянальным заканадаўствам Беларусі, калі яно ўстанаўлівае адпаведны нарматыў, і міжнароднымі стандартамі, перадусім Правіламі Нэльсана Мандэлы і рэкамендацыямі Міжнароднага камітэта Чырвонага Крыжа.

Афіцыйныя даныя адміністрацыі папраўчых устаноў недаступныя. Таму даследаванне грунтуецца на супастаўленні некалькіх тыпаў крыніц: інтэрв'ю з былымі зняволенымі, дакладаў праваабарончых арганізацый, афіцыйнай

дзяржаўнай статыстыкі Мінпрыроды, Белстата і санітарных службаў, а таксама матэрыялаў спецыяльных працэдур ААН.

Супастаўленне ПК-4 і ПК-1 дазваляе праверыць, ці паўтараюцца асобныя праблемы ў дзвюх установах, якія істотна адрозніваюцца паводле месцазнаходжання і ўмоваў утрымання. Пры інтэрпрэтацыі вынікаў улічваецца і розніца ў гендарным складзе: ПК-4 з'яўляецца жаночай, а ПК-1 — мужчынскай калоніяй, таму частка разыходжанняў паміж імі можа быць звязаная не толькі з тэрытарыяльнымі і інфраструктурнымі фактарамі.

Асноўныя вынікі

Па кожным з прааналізаваных напрамкаў выяўляецца разыходжанне паміж міжнароднымі стандартамі, нацыянальным рэгуляваннем і фактычнымі ўмовамі ўтрымання. Нацыянальнае заканадаўства ў шэрагу выпадкаў альбо не змяшчае колькасных нарматываў, альбо ўсталёўвае паказчыкі на ўзроўні міжнароднага мінімуму ці ніжэй. Пры гэтым фактычныя ўмовы, апісаныя былымі зняволенымі, у шэрагу выпадкаў не адпавядаюць і гэтым патрабаванням.

Дадатковую праблему стварае недаступнасць асобных нарматыўных актаў. У прыватнасці, тэхнічны нарматыў ТКП 310-2011 «Будынкі, збудаванні следчых ізалятараў, арыштных дамоў і турмаў», на які адміністрацыя спасылаецца як на падставу асобных практык, адсутнічае ў адкрытым доступе і не можа быць незалежна праверaны.

Паветра і прамысловае атачэнне

ПК-1 непасрэдна мяжуе з нафтахімічным комплексам «Нафтан». Сведчанні зняволеных пра якасць паветра разглядаюцца ў дакладзе разам з афіцыйнымі данымі дзяржаўнага маніторынгу атмасфернага паветра.

Водазабеспячэнне

Паводле даных Гомельскага гарадскога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі, у размеркавальнай сетцы Гомеля рэгулярна фіксуюцца перавышэнні нарматываў па ўзроўні жалеза і каламутнасці вады; максімальныя паказчыкі за

даступны перыяд былі зафіксаваныя ў I квартале 2026 года. Санітарная служба звязвае гэтыя перавышэнні са станам водаправодных сетак[1].

Тэмпературны рэжым

3 траўня 2026 года ў Беларусі адсутнічае дзейны колькасны нарматыў тэмпературы нават для звычайных жылых памяшканняў.

Спецыяльнага адкрытага нарматыву для месцаў пазбаўлення волі таксама не выяўлена.

Здароўе

Кліматычны стрэс, уключаючы ўплыў спёкі і холаду, ва ўмовах пазбаўлення волі дзейнічае не ізалявана, а ў спалучэнні з іншымі фактарамі: хранічнымі захворваннямі, абмежаваным доступам да медыцынскай дапамогі, вытворчымі нагрузкамі і іншымі неспрыяльнымі ўмовамі ўтрымання. Паводле даных Праваабарончага цэнтра «Вясна», на жнівень 2026 года сярод 863 палітычных зняволеных у 266 былі задакументаваныя сур'ёзныя праблемы са здароўем.

Рэкамендацыі

Рэкамендацыі адрасаваныя дзяржаўным органам Беларусі і міжнародным механізмам. Сярод іх — забеспячэнне публічнага доступу да тэхнічных нарматываў, якія рэгулююць умовы ўтрымання, усталяванне колькасных стандартаў у тых сферах, дзе яны адсутнічаюць, а таксама ўлік экалагічных умоваў утрымання палітычных зняволеных у працы адпаведных механізмаў ААН.

Поўны пералік рэкамендацый прыведзены ў канцы даклада.

1 https://www.gomelgcge.by/?page_id=12062

1 Уводзіны

Пенітэнцыярныя ўстановы традыцыйна аналізуюцца праз прызму бяспекі, пакарання і рэабілітацыі, у той час як іх экалагічнае вымярэнне, уключаючы якасць паветра і вады, санітарныя ўмовы і ўстойлівасць да кліматычных экстрэмумаў, доўгі час заставалася на перыферыі як праваабарончых, так і акадэмічных даследаванняў.

У апошнія гады сітуацыя пачынае змяняцца. У 2025 годзе UNICRI і Penal Reform International апублікавалі даклад Green Prisons, у якім адзначаецца, што турмы маюць значны экалагічны след, аднак па-ранейшаму застаюцца па-за многімі дыскусіямі пра ўстойлівае развіццё. Аўтары таксама звяртаюць увагу на тое, што змена клімату і экалагічная нестабільнасць здольныя ўзмацняць ужо існуючыя ўразлівасці зняволеных і ствараць дадатковыя рызыкі для іх здароўя і бяспекі[2].

Паралельна глабальны агляд акадэмічнай літаратуры паказвае, што ўзаемасувязь клімату, правоў чалавека, экалагічнай справядлівасці і ўмоваў утрымання ў месцах пазбаўлення волі застаецца адной з найменш вывучаных сфер, дзе захоўваюцца істотныя прабелы ў эмпірычных дадзеных[3].

Дадзенае даследаванне разглядае гэтую праблематыку на прыкладзе Беларусі і засяроджваецца на экалагічных умовах утрымання палітычных зняволеных і іх магчымым выкарыстанні як інструмента выбарачнага ціску.

Згодна з дадзенымі, атрыманымі Міжнародным камітэтам па расследаванні катаванняў у Беларусі на аснове інтэрв'ю з былымі палітычнымі зняволенымі, у беларускіх месцах пазбаўлення волі фіксуюцца адрозненні ва ўмовах утрымання палітычных і непалітычных зняволеных. У прыватнасці, у асобных задакументаваных выпадках палітычных зняволеных пазбаўлялі матрацаў,

2 https://cdn.penalreform.org/wp-content/uploads/2025/03/Green-prisons_-PRI_UNICRI_2025.pdf

3 https://www.emerald.com/ijoph/article/doi/10.1108/IJOPH-11-2025-0090/1346778

прадуктовых перадач і доступу да пітной вады, абмяжоўвалі вентыляцыю і магчымасць захоўваць гігіену.

Сведчанні таксама ўказваюць на выкарыстанне тэмпературных экстрэмумаў як формы ціску. У адным з задакументаваных выпадкаў былы зняволены апісваў камеру СІЗА КДБ, разлічаную на чатырох чалавек, дзе адначасова знаходзіліся сямёра пры заблакаванай вентыляцыі і тэмпературы каля 40 ˚С.

Група незалежных экспертаў ААН па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі асобна зафіксавала ўздзеянне на палітычных зняволеных экстрэмальных тэмператур, утрыманне ў антысанітарных камерах і пазбаўленне базавых прадметаў гігіены як элементы сістэматычнага жорсткага абыходжання[4].

Такім чынам, неспрыяльныя экалагічныя ўмовы ўтрымання ў беларускай пенітэнцыярнай сістэме могуць быць не толькі наступствам недахопаў інфраструктуры і агульнага функцыянавання ўстаноў, але і, у асобных выпадках, выкарыстоўвацца мэтанакіравана і выбарачна.

Даследчае пытанне гэтага даклада сфармулявана наступным чынам: якія задакументаваныя экалагічныя ўмовы ўтрымання палітычных зняволеных у ПК-4 і ПК-1, уключаючы тэмпературны рэжым, санітарыю, водазабеспячэнне і якасць паветра, і ў якой ступені яны адпавядаюць нацыянальным нормам Беларусі і міжнародным стандартам утрымання?

Праца выканана як даследчы даклад, адрасаваны механізмам ААН, і пабудавана на аналізе інтэрв'ю з вызваленымі палітычнымі зняволенымі, дапоўненым трыянгуляцыяй з дакладамі праваабарончых арганізацый у выгнанні і міжнародных маніторынгавых структур.

4 https://digitallibrary.un.org/record/4077808?v=pdf

2 Метадалогія і абмежаванні даследавання

Метадалогія

Даследаванне мае якасны характар: эмпірычнай базай служыць корпус паўструктураваных інтэрв'ю з былымі зняволенымі беларускіх папраўчых калоній. Даклад грунтуецца на канфідэнцыйных матэрыялах, уключаючы сведчанні з першых рук, а таксама на адкрытых крыніцах. Сведчанні зняволеных разглядаюцца як першасная крыніца ведаў пра ўмовы ўтрымання. Такая пазіцыя абумоўлена сістэмным прабелам у існуючых падыходах у дачыненні да закрытых аўтарытарных кантэкстаў.

Для беларускага выпадку задакументаваны корпус незалежных сведчанняў указвае на выбарачнае пагаршэнне ўмоваў менавіта для палітычных зняволеных. Інстытуцыйныя даклады ААН і міжнародных НДА пераважна распрацаваныя ў дачыненні да дэмакратычных дзяржаў з пэўнай ступенню празрыстасці пенітэнцыярнай сістэмы. Ні даклад UNICRI/PRI, ні глабальны скапінг-агляд (scoping review) не вылучаюць палітычных зняволеных як асобную аналітычную катэгорыю і не прапануюць метадалогіі, прыдатнай для закрытых аўтарытарных кантэкстаў. Дадзенае даследаванне запаўняе гэтую метадалагічную нішу[5].

Фрагменты інтэрв'ю былі арганізаваныя па дзевяці тэматычных блоках: спёка; холад; дождж і ўборка снегу; адключэнні; звароты і скаргі; медыцынская дапамога; дыферэнцыяцыя асоб, якія стаяць на прафілактычным уліку; санітарыя; якасць вады. Асноўны масіў аналізу пабудаваны на фрагментах, якія адносяцца да дзвюх устаноў: ПК-4 і ПК-1.

Афіцыйныя дадзеныя турэмнай адміністрацыі Беларусі недаступныя для незалежнага даследавання з прычыны закрытага характару пенітэнцыярнай

5 https://www.emerald.com/ijoph/article/doi/10.1108/IJOPH-11-2025-0090/1346778

сістэмы. Правіла 83 (1) (а) Правілаў Нэльсана Мандэлы ўстанаўлівае стандарт рэгулярных інстытуцыйных інспекцый як норму. Неадпаведнасць беларускай сістэмы гэтаму стандарту сама па сабе з'яўляецца прадметам фіксацыі, а не тэхнічнай перашкодай, якую варта абыходзіць моўчкі[6].

Кампенсацыяй служыць нарматыўна-супастаўляльны аналіз у двух рэгістрах. Кожны тэматычны блок супастаўляецца з нормамі:

1. нацыянальнага заканадаўства Беларусі — там, дзе адпаведная норма ўвогуле ўстаноўлена;
2. міжнароднага стандарту — перадусім Правілаў Нэльсана Мандэлы і арыенціраў Міжнароднага камітэта Чырвонага Крыжа.

Абмежаванні даследавання

Аформіць афіцыйны запыт у Дэпартамент выканання пакаранняў або атрымаць спадарожнікавыя здымкі высокай раздзяляльнасці непасрэдна тэрыторый ПК-4 і ПК-1 у межах гэтай працы не ўдалося. Даступныя адкрытыя геаданыя і агульнадаступныя картаграфічныя сервісы дазваляюць убачыць агульную планіроўку аб'ектаў, але не маюць дастатковай раздзяляльнасці для ацэнкі стану канкрэтных будынкаў, даху або лакальных крыніц забруджвання на тэрыторыі ўстаноў. Гэта абмяжоўвае магчымасці дыстанцыйнай верыфікацыі сведчанняў пра канкрэтныя аб'екты, у прыватнасці пра аварыйны будынак каранціну ў ПК-1 і стан асобных карпусоў у ПК-4.

Дадатковым абмежаваннем з'яўляюцца агульная якасць і даступнасць дзяржаўнай статыстыкі Беларусі. Напрыклад, з 2023 года Белстат паводле заканадаўства мае права абмяжоўваць распаўсюджванне дадзеных са спасылкай на «нацыянальную бяспеку».

Афіцыйны кліматычны і экалагічны маніторынг таксама мае межы дакладнасці: адна метэастанцыя фіксуе дадзеныя для цэлага горада і не адлюстроўвае ўмоваў у канкрэтных раёнах. Тая ж праблема ўзнікае ў дачыненні да дадзеных Мінпрыроды па Гомелі і Наваполацку. Акрамя таго, эксперты адзначаюць немагчымасць атрымання дэталізаваных геаданых па тэрыторыі ПК-4 і ПК-1.

6 https://www.unodc.org/documents/justice-and-prison-reform/Nelson_Mandela_Rules-E-ebook.pdf

Там, дзе дзяржаўнай статыстыкі недастаткова, яе часткова можа кампенсаваць грамадскі маніторынг, аднак і тут магчымасці абмежаваныя. Басейнавыя саветы, фармальна створаныя для ўдзелу грамадскасці ў кіраванні воднымі рэсурсамі краіны, на практыцы выключаюць экалагічныя грамадскія аб'яднанні. Многія з такіх аб'яднанняў былі ліквідаваныя, што зніжае ўзровень незалежнай экспертызы і падрывае давер да вынікаў ацэнкі стану водных аб'ектаў[7].

Аналагічная карціна фіксуецца ў дачыненні да грамадскага маніторынгу якасці паветра. Існуючыя падобныя грамадзянскія ініцыятывы, якія выкарыстоўваюць сеткі нізкабюджэтных датчыкаў, не маюць кропак вымярэння непасрэдна побач з прааналізаванымі ў гэтай працы ўстановамі — ПК-4 і ПК-1. Таму іх дадзеныя не дазваляюць незалежна праверыць сведчанні пра якасць паветра ў гэтых канкрэтных населеных пунктах[8].

У мэтах бяспекі персанальныя дадзеныя рэспандэнтаў і рэспандэнтак у гэтым дакладзе не раскрываюцца. Прамыя цытаты з інтэрв'ю публікуюцца толькі ў тых выпадках і ў тым аб'ёме, які дазваляе атрыманая згода на выкарыстанне сведчання. Службовыя ідэнтыфікатары інтэрв'ю ў апублікаванай версіі даклада не прыводзяцца.

7 https://belarusgreen.vision/wp-content/uploads/2025/07/belarusian-cso-report-on-sdgs-implementation.pdf

8 https://map.airmq.by

3 Дзве даследаваныя пляцоўкі

Праца супастаўляе дзве ўстановы, якія знаходзяцца ў розных прыродных і інфраструктурных умовах. Калі адна і тая ж прыкмета выяўляецца ў абедзвюх установах, верагоднасць таго, што яна тлумачыцца выключна мясцовымі абставінамі, зніжаецца.

Пры гэтым супастаўленне дзвюх пляцовак абмежавана яшчэ адным істотным адрозненнем, якое неабходна ўлічваць пры інтэрпрэтацыі вынікаў: ПК-4 з'яўляецца жаночай папраўчай калоніяй, а ПК-1 — мужчынскай. Гэта азначае, што частку магчымых разыходжанняў паміж пляцоўкамі, у прыватнасці ў санітарным блоку, нормах гігіены і водаспажыванні, нельга адназначна патлумачыць толькі прыроднымі або інфраструктурнымі адрозненнямі паміж Гомелем і Наваполацкам. Яна можа тлумачыцца розным гендарным складам зняволеных і, адпаведна, адрозненнямі ў афіцыйных нормах забеспячэння, напрыклад, у частцы мыцця для мужчын і жанчын там, дзе такая дыферэнцыяцыя ўстаноўлена заканадаўствам.

Там, дзе гэта дарэчна, далейшае супастаўленне па магчымасці раздзяляе два тыпы тлумачэнняў: тэрытарыяльнае і гендарнае. Аднак цалкам размежаваць іх на падставе наяўных дадзеных не заўсёды магчыма.

Гендарнае вымярэнне пацвярджаецца і на інстытуцыйным узроўні. Спецыяльны дакладчык па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі Нільс Муйжніекс, Спецыяльны дакладчык па пытанні катаванняў і Рабочая група па пытанні дыскрымінацыі ў дачыненні да жанчын і дзяўчынак фіксуюць перапоўненасць месцаў утрымання пад вартай, дрэнныя гігіенічныя ўмовы, адсутнасць чыстай вопраткі і прыватнасці для жанчын-зняволеных у Беларусі[9].

9 https://www.ohchr.org/en/press-releases/2025/01/belarus-experts-deplore-blatant-lack-accountability-ill-treatment-women

3.1 ПК-4, Гомель

ПК-4 — жаночая папраўчая калонія ў Гомелі. Гомель размешчаны на рацэ Сож, у басейне Дняпра.

Гаспадарча-пітное водазабеспячэнне Гомеля грунтуецца на падземных водах. Гарадская сістэма ўключае сем групавых водазабораў, абсталяваных станцыямі абезжалезвання. Неабходнасць абезжалезвання на ўсіх водазаборах указвае на натуральна павышаны ўзровень жалеза ў падземных водах раёна, што з'яўляецца тыповай асаблівасцю гэтай часткі басейна Дняпра[10].

Істотна, што, паводле даных санітарнай службы горада, у размеркавальнай сетцы фіксуюцца перавышэнні гігіенічных нарматываў: узровень жалеза дасягае 1,7 мг/дм^3 пры нарматыве не больш за 0,3 мг/дм^3, а каламутнасць — 4,64 мг/дм^3 пры нарматыве не больш за 1,5 мг/дм^3. Прычыну санітарная служба звязвае са станам водаправодных сетак, а адной з мер рэагавання называе іх прамываннe[11].

Гэты факт мае падвойнае значэнне. Па-першае, ён усталяваны незалежна ад паказанняў былых зняволеных і адносіцца да гарадской сістэмы водазабеспячэння, спажыўцом якой з'яўляецца ўстанова. Па-другое, ён лакалізуе праблему ў размеркавальнай сетцы, а не ў крыніцы вады. Пры гэтым калонія мае ўласныя ўнутраныя сеткі і назапашвальныя ёмістасці, стан якіх нідзе публічна не апісаны.

Асобная характарыстыка пляцоўкі звязаная з сезоннасцю. Рэспандэнткі апісваюць штогадовае масавае з'яўленне гнюсаў у канцы траўня і ў чэрвені. Поймавыя ландшафты Сожа і Дняпра ствараюць умовы для развіцця крывасмактальных двукрылых, і сезоннасць, якую называюць рэспандэнткі, адпавядае гэтым умовам.

Гэтыя звесткі пацвярджаюцца і дакладам Міжнароднага камітэта па

10 https://www.gomelgcge.by/?page_id=12062
11 https://www.gomelgcge.by/?page_id=12062

расследаванні катаванняў у Беларусі «Катаванні і жорсткае абыходжанне ў гомельскай жаночай калоніі № 4», заснаваным на 20 інтэрв'ю з былымі жанчынамі-палітзняволенымі, якія адбывалі пакаранне ў ПК-4 з траўня 2021 па люты 2024 года[12].

12 https://legin.info/documents/44

3.2 ПК-1, Наваполацк

ПК-1 размешчана ў Наваполацку Віцебскай вобласці. Наваполацк знаходзіцца на Заходняй Дзвіне, у басейне Балтыйскага мора, і з'яўляецца найбуйнейшым нафтахімічным цэнтрам краіны. Прамысловы характар горада азначае высокі аб'ём прамысловага водаспажывання і водаадвядзення ў межах адной гарадской сістэмы.

Даклад Міжнароднага камітэта па расследаванні катаванняў у Беларусі «Канвеер катаванняў» апісвае калонію як «самую брудную з экалагічнага пункту гледжання». У дакладзе таксама адзначаецца, што зняволеных размяркоўваюць на найбольш шкодныя вытворчыя ўчасткі незалежна ад іх кваліфікацыі і стану здароўя. Сярод іх згадваюцца перапрацоўка пластыку, звязаная з таксічнымі выпарэннямі, і вытворчасць вугалю, якая прадугледжвае пастаяннае ўздзеянне вугальнага пылу[13].

Далей адрозненні паміж ПК-4 і ПК-1 улічваюцца пры аналізе кожнага тэматычнага блока. Супастаўленне дзвюх структурна розных установ дазваляе асобна разглядаць уплыў прыроднага і прамысловага асяроддзя, стану інфраструктуры і асаблівасцяў арганізацыі ўмоваў утрымання, адначасова ўлічваючы абмежаванні такога параўнання, пазначаныя вышэй.

13 https://torturesbelarus2020.org/wp-content/uploads/2025/11/na-sajt-pytki.pdf

4 Нарматыўная рамка: міжнародныя і нацыянальныя дакументы

Міжнародныя стандарты

Стандартныя мінімальныя правілы ААН абыходжання са зняволенымі (Правілы Нэльсана Мандэлы) устанаўліваюць базавыя патрабаванні па тэматычных блоках гэтага даследавання. Правілы распаўсюджваюцца і на Беларусь. Для гэтага дакумента асабліва важныя наступныя палажэнні[14].

Матэрыяльныя ўмовы і паветра

Правіла 13 патрабуе, каб памяшканні, прызначаныя для пражывання зняволеных, адпавядалі санітарным патрабаванням з улікам кліматычных умоваў, кубічнага аб'ёму паветра, асвятлення, ацяплення і вентыляцыі. Правіла 14 патрабуе наяўнасці вокнаў, якія забяспечваюць натуральнае асвятленне і паступленне свежага паветра незалежна ад наяўнасці штучнай вентыляцыі. Правіла 17 патрабуе падтрымання чысціні ва ўсіх памяшканнях, якія рэгулярна выкарыстоўваюцца.

Санітарыя і гігіена

Правіла 15 патрабуе наяўнасці санітарных установак, якія дазваляюць зняволеным спраўляць натуральныя патрэбы ў чыстых і прыстойных умовах. Правіла 16 патрабуе лазневых установак належнай тэмпературы і магчымасці прымаць ванну або душ з частатой, неабходнай для агульнай гігіены з улікам клімату, але не радзей за адзін раз на тыдзень ва ўмераным клімаце. Правіла

14 https://www.unodc.org/documents/justice-and-prison-reform/Nelson_Mandela_Rules-E-ebook.pdf

18 патрабуе забеспячэння вадой і туалетнымі прыладамі, неабходнымі для падтрымання здароўя і чысціні. Правіла 19 патрабуе прадастаўлення адзення, якое адпавядае клімату.

Дысцыпліна і адзіночнае зняволенне

Правіла 43 забараняе працяглае абобестэрміновае адзіночнае зняволенне, змяшчэнне зняволенага ў пастаянна асветленую камеру, скарачэнне харчавання або пітной вады, а таксама калектыўныя пакаранні.

Кіраўніцтва Міжнароднага камітэта Чырвонага Крыжа Water, Sanitation, Hygiene and Habitat in Prisons[15] і яго дадатковае выданне Supplementary Guidance[16] пераводзяць агульныя патрабаванні ў вымяральныя тэхнічныя велічыні, якія адсутнічаюць у саміх Правілах Нэльсана Мандэлы.

У прыватнасці, кіраўніцтва ўстанаўлівае арыенцір у 100–150 г мыла на чалавека ў месяц; мінімум 3–5 л вады ў суткі для выжывання і 10–15 л у суткі для падтрымання здароўя; а таксама прапануе асобны кантрольны спіс для інжынернай ацэнкі вентыляцыі, водазабеспячэння, каналізацыі і выдалення адходаў.

Гэтыя велічыні выкарыстоўваюцца ў гэтай працы як колькасная шкала супастаўлення там, дзе нацыянальнае заканадаўства Беларусі само ўсталёўвае колькасныя нормы.

Нацыянальнае заканадаўства Беларусі

Шэраг нарматыўных дакументаў, якія рэгулююць умовы ўтрымання ў беларускіх месцах пазбаўлення волі, не знаходзіцца ў адкрытым доступе. Найбольш паказальны выпадак — тэхнічны нарматыў ТКП 310-2011 «Будынкі, збудаванні следчых ізалятараў, арыштных дамоў і турмаў», на які адміністрацыя наўпрост спасылаецца як на падставу канкрэтных практык, у прыватнасці ўстаноўкі глухіх кратаў на вокны камер. Пры гэтым тэкст дакумента адсутнічае ў электронных базах прававой інфармацыі і ва ўсіх праверaных навукова-тэхнічных бібліятэках, уключаючы рэспубліканскую.

15 https://www.icrc.org/en/publication/0823-water-sanitation-hygiene-and-habitat-prisons
16 https://www.icrc.org/sites/default/files/external/doc/en/assets/files/publications/icrc-002-4083.pdf

Гэта азначае, што нават там, дзе норма фармальна існуе, яе змест немагчыма незалежна праверыць, а адпаведнасць міжнародным стандартам — ацаніць.

Норма плошчы і матэрыяльна-бытавое забеспячэнне

Артыкул 94 Крымінальна-выканаўчага кодэкса Рэспублікі Беларусь устанаўлівае норму жылой плошчы не менш за 2 м² на аднаго асуджанага ў калоніях і турмах, 3,5 м² — у выхаваўчых калоніях і 3 м² — у лячэбных папраўчых установах. Кодэкс таксама замацоўвае права на індывідуальнае спальнае месца, пасцельныя прыналежнасці, адзенне і сродкі асабістай гігіены, перадаючы ўсталяванне канкрэтных нормаў харчавання і гігіены Савету Міністраў. Велічыня 2 м² адпавядае таму ўзроўню, які ў практыцы МКЧК разглядаецца як абсалютны крызісны мінімум, а не працоўны стандарт.

Санітарная інфраструктура

Правілы ўнутранага распарадку папраўчых устаноў, зацверджаныя пастановай МУС № 174 ад 20.10.2000, патрабуюць наяўнасці лазні з пральняй і дэзынфекцыйнай камерай у жылой зоне (п. 14) і ўскладаюць на асуджаных абавязак выконваць правілы асабістай гігіены і ўтрымліваць памяшканні ў чысціні (п. 57.6). Асобна прадугледжаны штомесячны агляд знешняга выгляду асуджаных, уключаючы адзенне і абутак, у межах якога таксама правяраецца санітарны стан жылых памяшканняў (п. 72). Пры гэтым ні частата мыцця, ні норма расходу вады на чалавека ў тэксце Правілаў не зафіксаваныя.

Колькасныя арыенціры

Там, дзе падзаконныя акты Беларусі ўсталёўваюць канкрэтныя велічыні, напрыклад у Правілах для адміністрацыйнага арышту, яны супастаўляльныя з арыенцірамі МКЧК або аказваюцца ніжэйшымі за іх. Норма туалетнага мыла складае 5 г на трое сутак для мужчын, то бок каля 50 г у месяц, і 10 г для жанчын, то бок каля 100 г у месяц, супраць арыенціру МКЧК у 100–150 г у месяц. Такім чынам, норма для мужчын устаноўлена прыкладна ўдвая ніжэй за міжнародны мінімум, а для жанчын супадае з яго ніжняй мяжой. Адпаведных нормаў для папраўчых калоній у адкрытым доступе не выяўлена.

Мікраклімат

Пастанова Міністэрства аховы здароўя № 95 ад 20.08.2015 усталёўвала для жылых дамоў тэмпературу паветра +18…+24 °C, вільготнасць не больш за 60 % і хуткасць руху паветра не больш за 0,3 м/с. Пры гэтым дастасавальнасць гэтага нарматыву да камер папраўчых калоній або СІЗА нідзе не была зафіксаваная. Профільны нарматыў — ТКП 310-2011 «Будынкі, збудаванні следчых ізалятараў, арыштных дамоў і турмаў», на які адміністрацыя спасылаецца як на падставу канкрэтных практык, — фактычна недаступны.

Умовы працы

Мікраклімат вытворчых памяшканняў, дзе працуюць асуджаныя, рэгулюецца агульным заканадаўствам аб ахове працы. Да ліку даступных дакументаў адносяцца Санітарныя нормы і правілы «Санітарна-эпідэміялагічныя патрабаванні да ўмоваў працы работнікаў, утрымання і эксплуатацыі вытворчых аб'ектаў», зацверджаныя пастановай Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь ад 19.07.2023 № 114 (СанПіН № 114), а таксама Санітарныя нормы і правілы «Патрабаванні да мікраклімату працоўных месцаў у вытворчых і офісных памяшканнях», зацверджаныя пастановай Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь ад 30.04.2013 № 33 (СанПіН № 33).

Асаблівасць кліматычнай палітыкі

Вызначаны на нацыянальным узроўні ўклад Рэспублікі Беларусь (ОНУВ) на 2026–2035 гады змяшчае метадалогію ацэнкі ўразлівасці насельніцтва да змянення клімату з размеркаваннем паводле полу, узросту, узроўню даходу і стану здароўя, а таксама асобны колькасны індэкс кліматычнай рызыкі для дзяцей.

Пры гэтым ні ОНУВ, ні нацыянальны даклад Мінпрыроды «Уразлівасць і адаптацыя да змянення клімату», ні іншыя даступныя дакументы кліматычнай палітыкі Беларусі не згадваюць асоб, пазбаўленых волі, як асобную катэгорыю ўразлівасці. У той жа час паводле фармальных крытэрыяў, якія выкарыстоўваюцца ў гэтых дакументах, уключаючы абмежаваную мабільнасць, залежнасць ад трэціх асоб у забеспячэнні базавых патрэбаў і павышаную фізіялагічную ўразлівасць часткі кантынгенту да тэмпературных экстрэмумаў, зняволеныя адпавядаюць профілю групы рызыкі.

Гэты прабел не з'яўляецца ўнікальным для Беларусі. Даклад UNICRI/PRI Green Prisons адзначае, што толькі нешматлікія краіны ўключылі пенітэнцыярныя ўстановы ў нацыянальныя планы адаптацыі да змянення клімату або іншыя кліматычныя стратэгіі. Сярод станоўчых прыкладаў прыводзяцца план энергетычнага сектара Малаві, які ўключыў турмы ў меры па павышэнні энергаэфектыўнасці печаў; першы нацыянальны план адаптацыі Новай Зеландыі, які наўпрост згадвае пенітэнцыярную інфраструктуру; і стратэгія адаптацыі да змянення клімату Міністэрства юстыцыі Вялікабрытаніі, якая ўлічвае кліматычную ўстойлівасць і энергаспажыванне турэмных будынкаў.

Беларусь у гэтым сэнсе адлюстроўвае агульнасусветны прабел. Аднак у беларускім выпадку адсутнасць пенітэнцыярнай сістэмы ў кліматычнай палітыцы спалучаецца з ужо задакументаванай у гэтай працы выбарачнай уразлівасцю палітычных зняволеных унутры гэтай сістэмы. Дзяржава распрацоўвае метадалогію ўліку ўразлівых груп, аднак катэгорыя, найбольш залежная ад інстытуцыйных рашэнняў у пытаннях адаптацыі да спёкі, холаду і стыхійных бедстваў, цалкам выпадае з поля зроку гэтай метадалогіі.

5 Вынікі: эмпірычны аналіз

У гэтым раздзеле прадстаўлены эмпірычны аналіз, пабудаваны на корпусе інтэрв'ю з былымі зняволенымі ПК-4 і ПК-1, дапоўненым незалежнымі дакладамі і афіцыйнымі дзяржаўнымі дадзенымі. Матэрыял арганізаваны па тэматычных блоках: паветра, санітарыя, якасць вады, уразлівасць здароўя, інфраструктурныя праблемы, гатоўнасць да бедстваў, успрыманне экалагічнай павесткі. Кожны з іх супастаўляе задакументаваную практыку з нарматыўнай рамкай, выкладзенай вышэй.

Такая структура дазваляе для кожнага блока паслядоўна адказаць на тры пытанні: што фактычна адбывалася паводле сведчанняў зняволеных і незалежных крыніц; ці адпавядала гэта нацыянальнай норме там, дзе яна ўстаноўлена; і ці адпавядала гэта міжнароднаму стандарту.

Там, дзе выяўляецца супадзенне паміж дзвюма структурна рознымі ўстановамі — жаночай калоніяй у Гомелі і мужчынскай у Наваполацку, — гэта разглядаецца як падстава для больш упэўненай высновы пра сістэмны, а не лакальны характар праблемы.

5.1 Паветра

Паводле дадзеных афіцыйнай статыстыкі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь, найбольш трывожным паказчыкам для Гомеля з'яўляецца канцэнтрацыя аксіду вугляроду (CO): сярэднегадавая канцэнтрацыя перавышала ўстаноўлены нарматыў 500 мкг/м^3 усе пяць гадоў запар: 639 мкг/м^3 у 2021 годзе, 654 у 2022-м, 617 у 2023-м, 640 у 2024-м і 577 мкг/м^3 у 2025 годзе. Забруджванне паветра чадным газам у Гомелі было не эпізадычнай з'явай, а хранічным фонам, які захоўваўся ўвесь перыяд, за які сабраныя сведчанні з ПК-4.

Што да цвёрдых часціц (ТЧ10), колькасць сутак з перавышэннем сярэднясутачнай ГДК вырасла з 67 у 2021 годзе да піка ў 103 у 2024-м, перш чым знізіцца да 30 у 2025 годзе. Сярэднегадавая канцэнтрацыя складала адпаведна 37, 31, 44, 44 і 23 мкг/м^3, то бок 2023–2024 гады былі прыкметна горшымі за 2021 год і асабліва за 2025-ы.

У Наваполацку паказальная дынаміка канцэнтрацыі дыяксіду серы (SO_2), які з'яўляецца прамым маркерам нафтаперапрацоўкі. Сярэднегадавая канцэнтрацыя ў 2021– 2022 гадах значна перавышала нарматыў 50 мкг/м^3: 68 мкг/м^3 у 2021 годзе і 87 мкг/м^3 у 2022-м, амаль удвая перавышаючы нарматыў у другім выпадку. Пасля гэтага адбылося рэзкае зніжэнне: 50 мкг/м^3 у 2023 годзе, 28 у 2024-м і 19 у 2025-м.

Два найгоршыя гады паводле забруджвання SO_2 у Наваполацку выпадаюць менавіта на пачатак перыяду, ахопленага інтэрв'ю па ПК-1, а паляпшэнне да 2024–2025 гадоў супадае з канцом гэтага перыяду. Што да дыяксіду азоту (NO_2), таксама фіксаваліся перавышэнні сярэднегадавога нарматыву 40 мкг/м^3: 41 мкг/м^3 у 2022 годзе і пік у 59 мкг/м^3 у 2023-м. Канцэнтрацыя CO вырасла з 327 мкг/м^3 у 2021 годзе да 485 мкг/м^3 у 2025-м, ушчыльную наблізіўшыся да нарматыву 500 мкг/м^3, але фармальна не перавысіўшы яго.

Хранічнае перавышэнне нарматыву CO у Гомелі ўяўляе сабой незалежнае ад сведчанняў зняволеных пацверджанне таго, што гарадское паветра ў прынцыпе не адпавядала нарматыву на працягу ўсяго перыяду назірання. Гэта мае значэнне пры ацэнцы скаргаў на духату і якасць паветра ў ПК-4.

Пры гэтым неабходна ўлічваць важнае абмежаванне: даныя Мінпрыроды атрыманыя на гарадскіх фонавых станцыях, а не непасрэдна на тэрыторыі або каля перыметра калоній. Разыходжанне паміж гарадской статыстыкай і канкрэтным досведам зняволеных, асабліва ў дачыненні да ПК-1, якая ўшчыльную прылягае да «Нафтана», метадалагічна чаканае і не абвяргае сведчанняў, а паказвае мяжу дакладнасці афіцыйнага маніторынгу.

Правіла 13 Правілаў Нэльсана Мандэлы патрабуе, каб жыллё зняволеных адпавядала патрабаванням здароўя з улікам кліматычных умоваў і кубічнага аб'ёму паветра; Правіла 14 патрабуе вокнаў, якія забяспечваюць паступленне свежага паветра незалежна ад штучнай вентыляцыі.

Адзіны публічна даступны колькасны арыенцір па мікраклімаце ў беларускім праве — пастанова Міністэрства аховы здароўя № 95 ад 20.08.2015 — усталёўваў тэмпературу паветра +18…+24 °C, вільготнасць не больш за 60 % і хуткасць руху паветра не больш за 0,3 м/с. Фармальна ён быў распрацаваны для жылых дамоў, а не для папраўчых установ, але пры адсутнасці спецыяльнай даступнай нормы гэта адзіная велічыня, з якой можна супастаўляць задакументаваныя каля 40 °C у камеры СІЗА КДБ. Можна меркаваць, што адпаведныя нарматывы змяшчаюцца ў ТКП 310-2011 «Будынкі, збудаванні следчых ізалятараў, арыштных дамоў і турмаў», аднак гэты дакумент фактычна недаступны.

Сведчанні былых зняволеных прама паказваюць на выкарыстанне тэмпературных экстрэмумаў і якасці паветра як формы ціску. Якасць паветра ў жылых памяшканнях калоніі вызначаецца не станам інжынерных сістэм, а палітыкай унутры калоній. Механічнай вентыляцыі няма; натуральная ёсць, але яе часта выводзяць з працы самі зняволеныя. Адзіным дзейным механізмам застаецца акно, а рашэнне аб яго адкрыцці прымае не той, хто дыхае.

Жылыя памяшканні: уладкаванне і вентыляцыя

Вентыляцыя

> *Механічнай вентыляцыі ў жылых бараках не было. Натуральная вентыляцыя была — вентыляцыйная шахта. З яе ішоў моцны скразняк, таму выхады шахты ў жылых секцыях заклейвалі паперай, каб захаваць цяпло.*

Адзіная наяўная сістэма вентыляцыі выводзілася з працы, прычым не праз нядбайнасць. Зняволеныя выбіралі паміж прытокам паветра і захаваннем цяпла — і выбіралі цяпло. Выбар быў вымушаны: тэмпературны рэжым памяшканняў не дазваляў мець і тое, і другое. Установе гэта было вядома або магло быць устаноўлена пры любым аглядзе: заклееныя паперай вентыляцыйныя краты бачныя няўзброеным вокам.

Вокны

> *У будынку атрадаў 5, 7 і 13 вокны займалі амаль усю сцяну з аднаго боку секцыі; вокнаў было чатыры ці пяць. Кратаў на вокнах у калоніі не было — яны меліся толькі ў каранцінным атрадзе. Адкрываліся створкі; фортачкамі не карысталіся, нават там, дзе яны былі. У многіх атрадах стаялі шклопакеты без фортачак, але з рэжымам праветрывання. Рэжымам праветрывання карысталіся, але рэдка: ён не забяспечваў вентыляцыі ў належнай ступені, таму звычайна адкрывалі створку. Рашэнне аб праветрыванні адміністрацыя не прымала — пытанне вырашаў актыў атрада.*

Адсутнасць кратаў і вялікая плошча шклення адрозніваюць атрадную сістэму ад камернага ўтрымання. Мікрарэжым падачы паветра працаваў дрэнна, а выбар паміж ім і цалкам адкрытай створкай рабілі самі зняволеныя.

Рэгуляванага паветраабмену ў памяшканні не існавала ўвогуле: толькі поўнае праветрыванне са стратай цяпла або адсутнасць прытоку.

Цвіль

> *У жылых памяшканнях атрада цвілі не было. Бытавыя ўмовы ў розных атрадах істотна адрозніваюцца, таму яе наяўнасць у іншых атрадах верагодная. Ва ўмывальніках, лазні і душавых цвіль была і рэгулярна выдалялася.*

Наяўнасць цвілі ў памяшканнях з пастаяннай вільготнасцю пры адсутнасці вентыляцыі заканамерная. З ёй змагаліся сіламі зняволеных і рэгулярна: праблема была вядомая і вырашалася ўборкай, а не ліквідацыяй прычыны.

Аб'ём паветра на чалавека

> *Жылая секцыя 13-га атрада: плошча каля 40 м² (ацэнка па памяці), вышыня столі 2,8 м, аб'ём 112 м³, пражываюць 32–35 чалавек. На аднаго чалавека прыпадае 1,14–1,25 м² плошчы і 3,2–3,5 м³ паветра. Прыведзеная плошча — агульная: яе частку займаюць двух'ярусныя ложкі, тумбачкі, табурэты і шафы, таму вольнага месца істотна менш. Плошча секцыі прыведзена па памяці, з агаворкай «прыкладна», і дакладным вымярэннем не пацверджана.*

Пункт 44 Правіл унутранага распарадку ўсталёўвае норму жылой плошчы ў папраўчых калоніях не менш за 2 м² на асуджанага; падвышанага нарматыву для жаночых калоній беларускае заканадаўства не ўтрымлівае. Пры такой норме ў секцыі могуць размяшчацца дваццаць чалавек, фактычна размяшчаліся 32–35.

Каб адпавядаць норме, памяшканне павінна было б мець плошчу 64–70 м². Паводле міжнародных арыенціраў, разыходжанне большае. Еўрапейскі камітэт па папярэджанні катаванняў лічыць мінімумам 4 м² на чалавека ў шматмесных памяшканнях, не ўключваючы ў разлік плошчу санітарнага вузла; Міжнародны камітэт Чырвонага Крыжа рэкамендуе для агульных спальных памяшканняў не менш за 3,4 м². Разліковае значэнне па ПК-4 больш чым утрая ніжэйшае за першы паказчык.

Прыўнос забруджванняў: адзенне, целы, курэнне

Адзенне і абутак

> *Целагрэйкі пралі адзін раз на год, форменны абутак меў устойлівы рэзкі пах, а асобнае памяшканне для іх захоўвання было не ва ўсіх атрадах. Там, дзе яго не было, целагрэйкі і абутак захоўваліся ў шафах жылых секцый, гэта значыць непасрэдна ў памяшканні, дзе людзі спяць. Сушыльнае памяшканне не было абсталявана вентыляцыяй, з-за чаго адзенне доўга сохла і набывала пах; частка зняволеных развешвала непранае адзенне.*

Пахі

> *Недахоп прыемных пахаў — тыповая рыса знаходжання ў калоніі. Непрыемна пахла ў сталовай, асабліва калі гатавалі тушаную капусту; рэзкі пах быў у памяшканні для захоўвання верхняга адзення і ў сушылцы; у секцыях адчуваўся пах нямытых целаў. Сярод зняволеных высока цаніліся шампуні, мыла і пральны парашок з моцным прыемным пахам — іх выкарыстоўвалі не толькі для гігіены, але і падчас уборкі, каб асвяжыць памяшканне.*

Пах станавіўся падставай для стаўлення да чалавека ўнутры калектыву: у той жа ўстанове апісаны булінг у дачыненні да тых, ад каго дрэнна пахла. Пры абмежаваным наборы адзення, лазневым дні раз на тыдзень і немагчымасці прасушыць рэчы выйсці з такога становішча ўласнымі сіламі немагчыма.

Курэнне

> *Курыць дазвалялася толькі на лакальным участку, у спецыяльна адведзеных месцах — курылках. Курэнне па-за курылкамі, нават у межах лакальнага ўчастка, строга забаранялася і каралася. Курылі танныя цыгарэты; зняволеныя, якія не атрымлівалі дапамогі з волі, курылі недакуркі — іх лёгка было пазнаць па рэзкім паху.*

Курэнне вынесена за межы жылых памяшканняў, што пры камерным утрыманні немагчыма: там дым застаецца там, дзе людзі спяць. Супастаўленне з мужчынскімі ўстановамі па гэтым паказчыку дае найбольш прыкметнае адрозненне.

Вытворчая зона

Вентыляцыя

> *Прымусовай вентыляцыі на фабрыцы таксама не было, хоць яна павінна быць прадугледжана — як мінімум над прасамі, а таксама ў цэхах, найперш у раскройным.*

Адсутнасць мясцовых выцяжных сістэм не адпавядае адразу чатыром нормам главы 12 СанПіН № 114, кожная з якіх датычыцца менавіта швейнай вытворчасці: пунктам 147, 149, 150 і 151.

Пыл

> *Умовы ўтрымання, праца на фабрыцы. Гэта пекла… Таксама няспраўная вентыляцыя, паўсюль чорны, дробны пыл. Каля майго працоўнага месца было ўсталявана дзесяць прасаў і прэсаў. Гэта пара тэмпературай сто градусаў… Не выконвалася належная плошча на аднаго чалавека паводле вытворчай нормы, усё было цесна. Гэта значыць, гэта вяло да вытворчага траўматызму. У нас былі людзі, якія і пальцы сабе там адразалі… Усе праходы былі завалены сінтэпонам, тканінамі*[17].

Пыл раслiннага і жывёльнага паходжання, у тым лiку тэкстыльны, у Беларусі адносіцца да шкодных вытворчых фактараў, пры працы з якімі праводзяцца абавязковыя перыядычныя медыцынскія агляды. Прафесійная паталогія, звязаная з такім пылам, вядомая і можа быць прадухілена з дапамогай вентыляцыі, сродкаў абароны і медыцынскіх аглядаў.

Насычэнне тканіны хімічнымі рэчывамі

> *Ад зняволеных у размовах часта і неаднаразова паступалі скаргі на алергічныя рэакцыі, звязаныя з насычэннем тканіны хімічнымі рэчывамі: слязіліся вочы, чырванелі і свярбелі рукі. Я адчувала гэта на сабе ў меншай ступені, бо ў асноўным працавала на ўчастку лекал.*

Хімічнае насычэнне тканін — вядомая крыніца кантактных і рэспіраторных рэакцый. Скаргі мелі масавы характар, гэта значыць праблема была вядомая; звестак пра выдачу сродкаў абароны, змяненне тэхналогіі або медыцынскае назіранне няма.

17 https://news.zerkalo.io/life/128018.html

Парушаюцца два патрабаванні СанПіН № 114: пункт 146 прадпісвае выветрываць штучныя матэрыялы ў складскіх памяшканнях перад падачай у цэх, а пункт 6 — забяспечыць на працоўным месцы магчымасць багатага прамывання скуры і слізістых праточнай вадой.

Афарбоўка цэха падчас працы

> *Перад праверкамі праводзілася частковая касметычная афарбоўка сцен у цэхах. Працу пры гэтым не спынялі. Пах не паспяваў выветрыцца, бо фарбавалі вельмі таннай фарбай з рэзкім пахам і патроху падфарбоўвалі на працягу некалькіх дзён. Так паўтаралася некалькі разоў.*

Афарбоўка цэхаў парушае пункт 23 СанПіН № 114, які забараняе правядзенне рамонту вытворчых памяшканняў і тэхналагічнага абсталявання падчас іх эксплуатацыі. Гэты ж СанПіН выкарыстоўваўся для пакарання зняволеных за пранясенне цукеркі на працоўнае месца як парушэнне забароны на прыём ежы ў вытворчых памяшканнях.

Сведчанні пра задуху і заблакаваную вентыляцыю незалежна пацвярджаюцца афіцыйнымі дадзенымі Мінпрыроды: хранічным перавышэннем нормы CO ў Гомелі на працягу ўсяго перыяду назірання і пікавымі паказчыкамі SO_2 у Наваполацку, якія па часе супадаюць з пачаткам перыяду інтэрв'ю па ПК-1. Адзіны публічны колькасны арыенцір па тэмпературы ў беларускім праве адсутнічае з траўня 2026 года.

5.2 Санітарыя

Недастатковая санітарная інфраструктура непасрэдна закранае чалавечую годнасць і можа мець наступствы для здароўя. У адрозненне ад многіх іншых неспрыяльных умоў утрымання, фізіялагічныя патрэбы немагчыма адкласці.

> *Практычна немагчыма было [памыцца, папраць рэчы, прывесці сябе ў парадак, зрабіць нейкія гігіенічныя працэдуры], быў адзін душ на ўвесь атрад.*

Задакументаваная практыка — адзін душ на атрад з 97–100 чалавек з доступам на працягу 30 хвілін у суткі, пры якім фізічна паспяваюць памыцца толькі 5–6 чалавек, менш за 6 % атрада за дзень, — не адпавядае ні ўнутранай, ні міжнароднай норме.

Інфармантка спасылаецца на ўнутранае правіла, якое прадпісвае мыццё не радзей за адзін раз за змену: 30 хвілін на 97 чалавек робяць заяўленую частату фізічна немагчымай для пераважнай большасці атрада незалежна ад фармулёўкі акта.

Пры гэтым Правіла 16 Правілаў Нэльсана Мандэлы патрабуе магчымасці мыцца не радзей за адзін раз на тыдзень ва ўмераным клімаце. Пры апісанай прапускной здольнасці — 5–6 чалавек у дзень на ўвесь атрад — рэальны інтэрвал паміж мыццём для большасці зняволеных складае каля двух-трох тыдняў, гэта значыць у два-тры разы перавышае міжнародны мінімум у адно мыццё на тыдзень.

Асобнага аналізу заслугоўвае не дэфіцыт часу сам па сабе, а механізм размеркавання: чарга ў душ кантралюецца не адміністрацыяй непасрэдна, а актывам атрада і загадчыцай гаспадаркі, якія супрацоўнічаюць з аператыўнай часткай. Такім чынам, базавая гігіенічная патрэба становіцца інструментам унутрыатраднай іерархіі, выбудаванай пры ўдзеле адміністрацыі. Фармальна нейтральны дэфіцыт інфраструктуры — адзін душ на атрад — рэалізуецца

выбарачна: лаяльныя атрымліваюць доступ, астатніх сістэматычна з яго выцясняюць.

Тыпы санвузлоў

> *Звычайнымі ўнітазамі былі абсталяваны вельмі нямногія атрады; у большасці выпадкаў усталёўваліся санітарныя чашы, умантаваныя ў падлогу. У пятым атрадзе адзін санвузел быў абсталяваны ўнітазамі, а другі — такімі падлогавымі чашамі. Відаць, гэта залежала ад выдзялення сродкаў на замену абсталявання.*

Два тыпы санвузлоў рознага ўзроўню ў адным будынку азначаюць, што замена абсталявання ішла па меры паступлення сродкаў і не была завершана. Такім чынам, розніца ва ўмовах існавала не толькі паміж будынкамі, але і ўнутры аднаго атрада, а значыць, магла па-рознаму размяркоўвацца паміж людзьмі.

> *Памяшканне 13-га атрада мела два санвузлы. У кожным было па чатыры ўнітазы і па шэсць умывальнікаў — усяго восем унітазаў і дванаццаць умывальнікаў на атрад, а таксама дзве душавыя кабіны за фіранкамі. Унітазы знаходзіліся ў кабінах з дзвярыма і былі абсталяваны гігіенічнымі душамі для жанчын. Колькасць людзей у атрадзе складала ад 91 да 97 чалавек. Такім чынам, на адзін унітаз прыпадае 11–12 чалавек, на ўмывальнік — 8, на душавую кабіну — 46–48.*

З міжнародных арыенціраў прымяняльныя рэкамендацыі Міжнароднага камітэта Чырвонага Крыжа: не менш за адзін унітаз на 25 чалавек і адну кропку для мыцця рук на 50 чалавек. Па гэтых паказчыках забяспечанасць 13-га атрада ў звычайным рэжыме перавышае патрабаванні.

Аднак чэргаў гэта не ліквідавала. Карыстацца сантэхнікай трэба было адначасова: каля сямідзесяці чалавек вярталіся са змены ў адзін прамежак

часу, а на ўсю паслядоўнасць гігіенічных працэдур адводзілася дваццаць хвілін.

Забяспечанасць, разлічаная на раўнамернае карыстанне на працягу сутак, такой нагрузкі не адлюстроўвае. Пры параўнанні паміж установамі паказчык «чалавек на адзін прыбор» варта прыводзіць разам з паказчыкам часу паводле распарадку. Душавыя кабіны — адзіны нізкі паказчык і пры асобным разглядзе: 46–48 чалавек на адну кабіну, пры якіх штодзённае мыццё немагчыма.

Прыватнасць і яе наступствы для здароўя

> *Часцей за ўсё санвузлы не былі індывідуальнымі: перагародкі былі, дзвярэй не было. Спраўленне натуральных патрэб выглядала так, быццам чалавек рабіў гэта на плошчы ва ўсіх навідавоку. Многія не маглі схадзіць нават па малой патрэбе; у большасці гэта праяўлялася як крызіс адаптацыі — запоры, бо па вялікай патрэбе ў такіх умовах схадзіць сапраўды немагчыма.*

Правіла 15 Правілаў Нэльсана Мандэлы патрабуе, каб зняволены мог спраўляць натуральныя патрэбы ва ўмовах чысціні і прыстойнасці. Прыстойнасць — не эстэтычнае пажаданне, а ўмова фізіялагічнай нормы, і прыведзенае назіранне паказвае гэта літаральна.

У праваабарончай практыцы такія наступствы амаль не дакументуюцца: яны не заўсёды ўспрымаюцца як асобнае парушэнне, пра іх няёмка расказваць, і ў інтэрв'ю пра іх не заўсёды пытаюцца. Між тым гэта адзін з нямногіх выпадкаў, калі ўздзеянне ўмоў на чалавека можна апісаць праз аб'ектыўны фізіялагічны паказчык.

Уборка і падтрыманне чысціні

> *У атрадзе рэгулярна праводзіліся так званыя генеральныя ўборкі;*

акрамя таго, атрад штодня старанна прыбіраўся ўласнымі сіламі. Асобна прыбіралі жылыя секцыі, асобна санвузлы, асобна калідоры. У цэлым усе былі зацікаўлены падтрымліваць чысціню і прыбіралі добрасумленна. Выдавалі хлорку, яе не шкадавалі; дадавалі ўласны шампунь для прыемнага паху. У цэлым было чыста.

У нас былі, напрыклад, генеральныя ўборкі па нядзелях… часам, як пакаранне, нам давалі ўборку, і пры гэтым гэта было не так, што мы прыбралі, скончылі — і ўсё, можам быць свабоднымі, а так, што мы прыбіраем да нейкага часу. То бок няважна, што мы ўжо прыбралі, скончылі, час яшчэ не скончыўся, таму мы павінны хадзіць і імітаваць нейкую дзейнасць, калі начальніца яшчэ не сказала, што мы можам скончыць.

Планавая ўборка ў атрадзе была арыентавана на выкананне канкрэтнай задачы і ў дастатковай ступені забяспечвалася матэрыяльна. Аднак разам з гэтым фіксавалася практыка прызначэння ўборкі ў якасці пакарання, пры якой аб'ём выкананай працы не меў значэння: пасля завяршэння задачы зняволеныя былі абавязаныя імітаваць дзейнасць да заканчэння часу, адвольна вызначанага начальнікам атрада.

Правіла 97 (1) Правілаў Нэльсана Мандэлы наўпрост забараняе выкарыстанне працы ў якасці меры дысцыплінарнага спагнання. Ператварэнне ўборкі з гаспадарчай задачы ў спосаб утрымліваць зняволеных на месцы пасля дасягнення выніку паказвае менавіта на карную, а не гаспадарчую функцыю меры, якая прымяняецца па-за фармальнай працэдурай спагнання і таму без якіх-небудзь працэсуальных гарантый для зняволенага.

Паразіты

Прусакоў і клапоў не было. Што здаралася — вошы. Вошы заносіліся з волі; часам іх не заўважалі падчас каранціннага агляду праз інкубацыйны перыяд. У каранціне праводзіўся толькі аднаразовы медыцынскі агляд; паўторнага, перад размеркаваннем па атрадах, не было. Усіх, хто жыў у адпаведнай групе ложкаў, накіравалі на тэрмічную апрацоўку пасцельных рэчаў, у медыцынскай частцы

агледзелі і апрацавалі валасы; стрыгчы не давялося. Іншыя зняволеныя ўспрымалі такія сітуацыі вельмі нервова.

У ПК-4 сістэматычнага заражэння паразітамі не назіралася, рэагаванне было хуткім, апрацоўка праводзілася, да прымусовай стрыжкі не звярталіся. Пры супастаўленні з калоніямі, дзе такія выпадкі маюць масавы або хранічны характар, гэта паказвае, што дэзынсекцыя і санітарная апрацоўка тэхнічна магчымыя ў сістэме і што іх адсутнасць у іншых установах тлумачыцца не немагчымасцю, а іншымі прычынамі.

Наколькі часта здараліся такія эпізоды, ацаніць складана. Часам гэта адбываецца адзін раз на год. Аднак, мяркуючы па дзеяннях адміністрацыі і актыву і па тым, як гэта абмяркоўвалася, падобныя выпадкі не з'яўляюцца чымсьці выключным — усе ведаюць, як трэба дзейнічаць. Непрыемна, але ў параўнанні з туберкулёзам не палохае.

Адпрацаванасць рэакцыі — ускосны паказчык частаты: парадак дзеянняў вядомы ўсім без тлумачэнняў, разгубленасці сітуацыя не выклікае. Дакладная колькасць выпадкаў вядомая толькі медыцынскай частцы і можа быць запатрабавана па афіцыйным запыце; экстрапаляваць адзін выпадак у атрадзе за год на дваццаць атрадаў недапушчальна.

Шкала ўспрымання рызык — педыкулёз як непрыемнасць, туберкулёз як пагроза — выглядае абгрунтаванай. Пры супастаўленні з мужчынскімі ўстановамі, дзе паразіты названыя сярод асноўных цяжкасцяў, розніца датычыцца распаўсюджанасці з'явы, а не яе ўспрымання.

Забеспячэнне сродкамі гігіены

Зняволеныя, якія не атрымлівалі грашовых пераводаў з дому, маглі напісаць заяву адміністрацыі калоніі на выдачу сродкаў гігіены за кошт Чырвонага Крыжа. Усе, хто меў на гэта права, такую заяву пісалі.

Частка палітычных зняволеных — уключаныя ў пералік асоб, датычных да тэрарыстычнай дзейнасці, а таксама асобныя людзі на асаблівым кантролі адміністрацыі — мелі забарону на атрыманне грашовых пераводаў, у тым ліку ад блізкіх сваякоў. Пры спробе пераводу праз сістэму электронных плацяжоў бухгалтэрыя звярала спісы ўручную, і пры наяўнасці забароны перавод вяртаўся адпраўніку.

Установа абавязана забяспечваць зняволеных сродкамі гігіены ў адпаведнасці з Правілам 18 Правілаў Нэльсана Мандэлы і Бангкокскім правілам 5. Фактычна гэтае пытанне вырашалася праз гуманітарную арганізацыю па заяве самога зняволенага.

Адначасова перадача рэчаў паміж зняволенымі забаронена пад пагрозай спагнання. У выніку чалавек, які застаўся без сродкаў, аказваецца перад выбарам паміж адмовай ад гігіены і дробным крадзяжом, а размеркаванне праз атрадны фонд і актыў існуе таму, што легальны механізм не працуе. Размеркаванне ажыццяўляў актыў, гэта значыць зняволеныя, надзеленыя адміністрацыяй паўнамоцтвамі. Доступ да базавых сродкаў гігіены аказваўся апасродкаваным унутранай іерархіяй.

Аварыі, засоры і ліквідацыя наступстваў

Унітазы ламаліся, асабліва гігіенічныя душы — не ўсе ўмелі імі карыстацца. Рамонт праводзіўся за кошт зняволеных, і загадчыца гаспадаркі атрада рабіла гэта аператыўна. Умывальнікі забіваліся ежай і валасамі; чысцілі іх самі, бо сантэхніка даводзілася доўга чакаць. Калі справіцца не ўдавалася, умывальнік выводзіўся з карыстання на некалькі дзён.

Рамонт санітарнага абсталявання за кошт зняволеных — гэта той жа перанос выдаткаў. Вывядзенне ўмывальніка з карыстання на некалькі дзён пры зыходнай нагрузцы каля васьмі чалавек на адзін прыбор адпаведна пагаршае забяспечанасць.

Прапускная здольнасць санітарнай інфраструктуры сістэматычна не адпавядае ні ўнутранай норме, ні міжнароднаму мінімуму МКЧК; дэфіцыт размяркоўваецца не адміністрацыяй непасрэдна, а праз актыў атрада, ператвараючы базавую гігіенічную патрэбу ў інструмент унутрыатраднай іерархіі.

5.3 Якасць вады

У жылой зоне вада была даступная. У вытворчай зоне сітуацыя адрознівалася паміж установамі. Якасць вады, якая падаецца ўстанове для гаспадарча-пітных патрэб, можа адхіляцца ад гігіенічных нарматываў па тых жа паказчыках, што і ў гарадской сетцы, прычым унутраныя сеткі і назапашвальныя ёмістасці ўстановы здольныя ўзмацніць гэтае адхіленне.

Рэспандэнтка з ПК-4 у адказ на прамое пытанне пра доступ да пітной вады на фабрыцы апісвае пітны фантанчык, размешчаны недалёка ад туалета, і ваду ў самім туалеце. Фармальна гэта забеспячэнне: кропка пітной вады на вытворчасці існуе. Аднак размяшчэнне адзінай названай кропкі ў непасрэднай блізкасці ад санітарнага вузла з'яўляецца самастойным санітарным пытаннем, а не дэталлю апісання.

У ПК-1 сітуацыя апісваецца інакш:

> *Вось ты вяртаешся ў атрад, табе хочацца хаця б раз на дзень папіць гарбаты, таму што на прамзоне ты там ні гарбаты не п'еш, нічога. Вада там толькі з умывальніка. Там таксама ніякай пітной вады няма. Хочаш — пі з умывальнікаў, хочаш — не пі.*

Тут адсутнічае не толькі асобная кропка пітной вады, але і размежаванне паміж вадой для гаспадарчых патрэб і вадой для піцця. Такім чынам, забеспячэнне пітной вадой у вытворчай зоне залежыць ад часу, якім распараджаецца адміністрацыя: вада ёсць, а прамежку, у які яе можна выпіць, можа не быць.

> *У атрадзе папіць можна было практычна заўсёды. Нават падчас абавязковага выхаваўчага мерапрыемства пры неабходнасці можна*

было выйсці ў туалет і папіць вады з умывальніка. Уначы дазвалялася ўставаць у туалет.

Вынік станоўчы і наўпрост суадносіцца з Правілам 22 Правілаў Нэльсана Мандэлы, якое патрабуе, каб пітная вада была даступная зняволенаму кожны раз, калі ён у ёй мае патрэбу. У жылой зоне ПК-4 гэтае патрабаванне фактычна выконвалася.

Там, дзе зняволеныя працуюць поўную змену, пітная вада ў адной з дзвюх установ не забяспечваецца як асобная катэгорыя і замяняецца вадой з умывальніка. У другой установе яна забяспечваецца, але адзіная названая кропка знаходзіцца пры санвузле. У абодвух выпадках фактычная магчымасць напіцца ў вытворчай зоне залежыць ад распарадку, а не толькі ад наяўнасці вады.

У матэрыялах па ПК-17 апісваюцца выразныя скурныя рэакцыі, якія рэспандэнт звязвае з якасцю вады:

Калі прыехаў у калонію, то там пасля гэтага душа ты проста як сабака чухаешся. Вось, калі чалавек, напрыклад, галаву не памыў, у яго перхаць сыплецца, то ў цябе сыплецца ўся скура, проста сыплецца, як перхаць. Таму што вада вельмі жорсткая. І, напрыклад, калі там лазневы дзень, я не ведаю, я там выбіраю, ну, проста не тое што выбіраю, а настройваюся памыцца, таму што ведаю: зараз высахну і буду чухацца, як сабака. Там вельмі вялікія праблемы з вадой, вельмі вялікія праблемы.

Рэспандэнт з ПК-3 апісвае сітуацыю з супрацьлеглым узроўнем забяспечанасці: душавыя ў цэху, даступныя штодня, з гарачай вадой, і пры гэтым тую ж катэгорыю скаргаў — пасля кантакту з вадой перыядычна з'яўляліся пухіры на целе, сверб і незразумелыя скурныя праявы.

У жылых будынках вада ў цэлым была нармальнай. Многім не падабаўся жалезісты прысмак, аднак якасць была нядрэннай. Часам, калі не хапала часу дачакацца чаргі да разеткі, растваральную каву разводзілі цёплай вадой з-пад крана.

Якасць вады ў ПК-4 не адносілася да ліку вострых праблем. У дачыненні да іншых установ, у прыватнасці да ПК-1 у Наваполацку, ёсць сведчанні супрацьлеглага зместу. Розніца паміж установамі тут сама па сабе з'яўляецца вынікам: яна паказвае, што прымальная якасць вады ў сістэме дасягальная.

Жалезісты прысмак паказвае на павышаны ўзровень жалеза, характэрны для падземных крыніц у рэгіёне, і гэта не здагадка, а задакументаваны факт для абодвух гарадоў.

Паводле афіцыйных даных Гомельскага гарадскога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі, забеспячэнне горада пітной вадой ажыццяўляецца праз сем групавых водазабораў, абсталяваных станцыямі абезжалезвання менавіта з гэтай прычыны. Тым не менш у размеркавальнай сетцы рэгулярна фіксуюцца перавышэнні нарматываў паводле ўзроўня жалеза і каламутнасці, якія ведамства наўпрост звязвае са станам сетак водазабеспячэння, а не крыніцы: ад 0,42–0,95 мг/дм^3 па жалезе ў 2024 годзе да максімуму ў 1,7 мг/дм^3 пры нарматыве не больш за 0,3 мг/дм^3 і каламутнасць — 4,64 мг/дм^3 пры нарматыве не больш за 1,5 мг/дм^3 у I квартале 2026 года. Гэта гістарычны максімум за ўвесь даступны перыяд назіранняў, гэта значыць сітуацыя не паляпшаецца, а пагаршаецца[18].

У Наваполацку афіцыйныя даныя водаканала за лістапад 2025 года паказваюць іншую карціну: сырая вада на водазаборы «Акунёва» таксама ўтрымлівае прыродна павышаную колькасць жалеза, у сярэднім 3,9 мг/дм^3 пры нарматыве для неапрацаванай вады 10,0 мг/дм^3. Аднак пасля станцыі абезжалезвання — як перад падачай у размеркавальную сетку, так і ў самой сетцы — зафіксавана поўная адпаведнасць нарматыву: 0 неадпаведнасцяў са 120 і 100 проб адпаведна, сярэдняя канцэнтрацыя 0,12–0,14 мг/дм^3 [19].

18 https://www.gomelgcge.by/?page_id=12062

19 https://npvkh.by/wp-content/uploads/2025/12/kachestvo-vody-noyabr-2025-novopoloczk.pdf

Такім чынам, паказчык па сваёй прыродзе адзін і той жа — геалагічна абумоўленае жалеза ў падземных водах рэгіёна, якое пры ўмераным перавышэнні не ўплывае на здароўе, — аднак менавіта на этапе размеркавальнай сеткі два гарады дэманструюць розны вынік. У Гомелі сетка сістэматычна вяртае жалеза і каламутнасць вышэй за нарматыў, у Наваполацку, паводле зрэзу за лістапад 2025 года, — не.

Гэта не абвяргае гіпотэзу пра ўласныя ўнутраныя сеткі і назапашвальныя ёмістасці ПК-1, паколькі гарадскія дадзеныя ахопліваюць сістэму ў цэлым, а не канкрэтна тэрыторыю ўстановы. Аднак для Наваполацка няма такога ж гарадскога фонавага пацверджання праблемы, якое ёсць па Гомелі.

> *Пры папярэджанні пра адключэнне ваду набіралі ва ўсе наяўныя вёдры; вядро з вадой ставілі ў кабіну, змывалі з дапамогай ёмістасцяў. Калі паведамлялі, што вада будзе адключана на тры-чатыры гадзіны, актыў мог сказаць, што па вялікай патрэбе трэба хадзіць толькі ў крайнім выпадку, — але гэта было хутчэй жартам, чым патрабаваннем: усім было зразумела, што выканаць яго немагчыма.*

Асобны эпізод датычыцца затаплення падвала пасля ліўняў:

> *Пасля ліўняў каналізацыя змешвалася з ліўневымі водамі і затапляла падвал аднаго з жылых будынкаў — відаць, з-за канструктыўных недахопаў. Ваду, змешаную з фекаліямі, трэба было вычарпаць. Чарпаў атрад, чыя чарга дзяжурыць на гаспадарчых работах прыпадала на гэты дзень. Улетку 2024 года гэта выпала і на атрад аўтара. У паўзмроку падвальнага памяшкання, дзе знаходзіліся бібліятэка і спартыўная зала, зняволеныя стаялі амаль па калена ў вадзе з фекаліямі, у гумовых тапках, і чэрпалі ваду рыдлёўкамі ў вёдры, выносілі і вылівалі яе на асфальт каля ўваходу ў падвал. Рэспіратараў не было. Фекаліі, што падсыхалі, заставаліся на асфальце яшчэ некалькі дзён, пакуль іх канчаткова не прыбралі. У работах удзельнічала каля дваццаці чалавек, працягваліся яны прыкладна дзве гадзіны. Пасля гэтага была дадзена магчымасць памыцца ў душы па-за графікам. У*

медыцынскую частку ніхто не звяртаўся, аднак удзельнікі адзначалі пагаршэнне самаадчування — галаўны боль, стомленасць, прыступы млоснасці.

Сімптомы, адзначаныя ўдзельнікамі, тыповыя для ўздзеяння газаў, якія ўтвараюцца пры раскладанні каналізацыйных сцёкаў, найперш серавадароду і аміяку, што назапашваюцца ў замкнёных неправетрываемых памяшканнях.

Супадзенне сімптомаў у розных удзельнікаў робіць іх прыкметай уздзеяння асяроддзя, а не індывідуальнай рэакцыі.

Работы ў такіх памяшканнях адносяцца да работ павышанай небяспекі і патрабуюць кантролю складу паветра, прымусовай вентыляцыі, абароны органаў дыхання, вачэй і скуры, спецыяльнага абутку, назірання за тымі, хто працуе, і наступнай санітарнай апрацоўкі. Нічога з гэтага не выконвалася; аднясенне работ да самаабслугоўвання ў адпаведнасці з артыкулам 101 КВК не вызваляе ад патрабаванняў аховы працы.

Адсутнасць зваротаў у медыцынскую частку не азначае адсутнасці шкоды: адмова ад звароту была звычайнай формай паводзінаў. Дакументальнага следу па эпізодзе не будзе, і яго адсутнасць не можа служыць аргументам супраць апісанага. Прадастаўленая па-за графікам магчымасць памыцца даказвае, што адміністрацыя ўсведамляла характар сітуацыі.

Абодва гарады маюць геалагічна абумоўленае павышанае ўтрыманне жалеза ў падземных водах. У Гомелі гэта рэгулярна праяўляецца як перавышэнне нарматыву ўжо ў размеркавальнай сетцы, з гістарычным максімумам у I квартале 2026 года; у Наваполацку зрэз за лістапад 2025 года паказвае поўную адпаведнасць сеткі нарматыву, што не выключае праблемы на ўзроўні ўнутраных сетак самой установы.

5.4 Уразлівасць здароўя

Белгідрамет наўпрост прызнае, што «высокія тэмпературы паветра вельмі негатыўна ўплываюць на здароўе насельніцтва», а хвалі спёкі называе «адной з прычын высокай смяротнасці насельніцтва ў летні перыяд»[20].

Пры гэтым для пенітэнцыярных устаноў Беларусі застаецца нявырашанай праблема доступу да медыцынскай дапамогі ў прынцыпе, а не толькі ў выпадках пагаршэння здароўя з-за спёкі, холаду або іншых небяспечных з'яў надвор'я.

> *Звычайным зняволеным прасцей было атрымаць бальнічны, некаторыя нават проста так: стаміліся, тыпу пайду на бальнічны. У маім выпадку — не. Я так зразумела, было нейкае ўказанне, нашай катэгорыі вельмі скептычна давалі бальнічны.*

Сведчанні, якія датычацца ПК-1 і ПК-4, незалежна адно ад аднаго апісваюць адну і тую ж структуру ўзаемадзеяння зняволенага з медыцынскай дапамогай. Для палітычных зняволеных прамая адмова не выкарыстоўваецца як фармальнае рашэнне, а дзейнічае сістэма працэдурных фільтраў, якія зніжаюць верагоднасць таго, што дапамога ўвогуле будзе аказана.

Група незалежных экспертаў ААН па Беларусі таксама канстатуе[21], што ў камерах падтрымліваецца экстрэмальна нізкая тэмпература, што ўплывае на рэалізацыю права на здароўе. Асобнай увагі заслугоўвае гендарны аспект: Група зафіксавала, што «жанчынам, якія знаходзяцца ў месцах пазбаўлення волі, адмаўляюць у медыцынскай дапамозе з улікам гендарных асаблівасцяў і падвяргаюць іх неспрыяльным умовам утрымання, уключаючы ўздзеянне моцнага холаду, што негатыўна адбіваецца на іх здароўі».

20 https://www.minpriroda.gov.by/ru/news-ru/view/vlijanie-klimaticheskix-izmenenij-na-pogodozavisimye-otrasli-ekonomiki-obsudili-na-kruglom-stole-v-belta-5045/

21 https://www.ohchr.org/ru/press-releases/2026/09/belarus-criminal-justice-system-weaponized-crush-dissent-un-experts-say

Важна таксама адзначыць, што людзі з хранічнымі захворваннямі складаюць значную частку палітычных зняволеных Беларусі. Паводле даных Праваабарончага цэнтра «Вясна», на жнівень 2026 года сярод 863 палітычных зняволеных у 266 былі задакументаваныя сур'ёзныя праблемы са здароўем. Гэтая група найбольш фізіялагічна ўразлівая да кліматычных фактараў.

Штогод у Беларусі хваробы сістэмы кровазвароту складаюць каля 53 % агульнай колькасці смерцяў, гэта значыць гаворка ідзе не пра тэарэтычны, а пра статыстычна дамінуючы фактар смяротнасці ў краіне ў цэлым. У дачыненні да месцаў пазбаўлення волі гэта азначае, што задакументаваны тэмпературны ціск — спёка да 40 °C у камерах, адсутнасць вентыляцыі — уздзейнічае на арганізм, кампенсаторныя рэзервы якога ўжо зніжаныя хранічным захворваннем. Таму затрымка з медыцынскай дапамогай, якая для здаровага чалавека магла б прайсці без наступстваў, для гэтай групы стварае рызыку незваротнай шкоды[22].

Аслаблены арганізм як фактар успрымальнасці

У ПК-1 уздзеянне холаду апісваецца наступным чынам:

> *Холад — гэта часта прачынаешся, праз холад па малой патрэбе ў туалет часта ходзіш... І пахудзенне ў штрафным ізалятары — гэта, у першую чаргу, страта вадкасці... за ноч 3–4 разы трэба прачнуцца, павярнуцца, таму што прачынаешся — ног не адчуваеш, альбо там проста ўжо балюча.*
>
> *Спяць на батарэі... я не раз бачыў апёкі на спіне ад таго, што людзі вось так засыналі, прыхіліўшыся да батарэі, і проста выпальвалі сабе скуру... такое, як крылы анёла... пухіры, ну, такое, таксама не ў аднаго чалавека бачыў.*

22 https://belarusgreen.vision/wp-content/uploads/2025/09/izmenenie_klimata_v_belarusi_kak_eto_vliyaet_na_zdorove_cheloveka.pdf

Асобны эпізод датычыцца спёкі на вытворчасці:

> *Адзін раз на прамзоне... была спёка, якраз улетку гэта было, вельмі горача было доўгі перыяд... я проста зняў кепку, каб галава падыхала... супрацоўнік... сказаў: «Я зафіксаваў факт твайго парушэння», — і склаў на мяне рапарт за парушэнне формы адзення.*

У дакладзе асобна адзначаецца, што цеплавы стрэс павышае агульную стрэсавую нагрузку на арганізм і зніжае ўстойлівасць да інфекцый у цэлым, што таксама можа ўплываць на здароўе чалавека.

У дачыненні да ПК-1 гэты тэзіс пацвярджаецца адначасовым дзеяннем некалькіх фактараў хранічнай стрэсавай нагрузкі. Даклад Міжнароднага камітэта па расследаванні катаванняў у Беларусі «Канвеер катаванняў» фіксуе пастаянны фізічны і псіхалагічны гвалт з боку персаналу, працу на найбольш шкодных і цяжкіх участках вытворчасці — перапрацоўку пластыку з таксічнымі выпарэннямі, вытворчасць вугалю з пастаянным уздзеяннем вугальнага пылу — незалежна ад кваліфікацыі і стану здароўя, а таксама сістэмную адмову ў кваліфікаванай медыцынскай дапамозе[23].

Сукупнасць гэтых фактараў прыводзіць да моцнага стрэсу. Арганізм, устойлівасць якога ўжо зніжана такой інстытуцыйнай нагрузкай, аказваецца менш здольным кампенсаваць дадатковы цеплавы або халадовы стрэс. Гэта робіць кліматычны фактар ва ўмовах ПК-1 не самастойнай, а ўзмацняльнай зменнай у адносінах да ўжо задакументаванага гвалту.

Адмова ў медыцынскай дапамозе рэалізуецца не як прамое рашэнне, а як сістэма працэдурных фільтраў; кліматычны стрэс дзейнічае як фактар, што ўзмацняе ўздзеянне на фоне ўжо зніжанай інстытуцыйным ціскам устойлівасці арганізма.

23 https://torturesbelarus2020.org/wp-content/uploads/2025/11/na-sajt-pytki.pdf

5.5 Інфраструктурныя праблемы

Правіла 13 Правілаў Нэльсана Мандэлы патрабуе, каб жыллё зняволеных адпавядала патрабаванням аховы здароўя з улікам кліматычных умоў, уключаючы ацяпленне; Правіла 14 патрабуе натуральнага асвятлення, дастатковага для чытання і працы без шкоды для зроку.

Раней у Беларусі пастанова Міністэрства аховы здароўя № 95 утрымлівала агульны жыллёвы нарматыў: тэмпература +18…+24 ˚С, вільготнасць не больш за 60 %. Пастанова страціла сілу, і з траўня 2026 года ў Беларусі няма дзейнага колькаснага нарматыву тэмпературы нават для звычайных жылых дамоў.

Для вытворчых памяшканняў мікраклімат рэгулюецца СН 4.02.03-2019 «Ацяпленне, вентыляцыя і кандыцыянаванне паветра», а асобныя патрабаванні да якасці штучнага асвятлення на працоўных месцах устанаўліваюцца санітарнымі нормамі па ахове працы.

Правілы ўнутранага распарадку папраўчых устаноў, зацверджаныя пастановай МУС № 174, у пункце 45 устанаўліваюць патрабаванне да канструкцыі аконных рашотак: яны павінны прапускаць натуральнае святло пры захаванні ізаляцыі. Пры гэтым Правілы не ўтрымліваюць колькасных норм ні па тэмпературы ўнутры жылых памяшканняў, ні па ўзроўні штучнага асвятлення.

Гэта азначае, што адсутнасць нацыянальнага колькаснага нарматыву сама па сабе робіць немагчымай унутраную праверку адпаведнасці: незалежна ад таго, наколькі холадна або цёмна ў канкрэтным памяшканні, фармальна параўноўваць гэта няма з чым, акрамя агульнага жыллёвага стандарту або міжнароднага арыенціру.

Ацяпленне і тэмпературны рэжым

Тэма ацяплення ў карпусах адбывання пакарання распадаецца на некалькі ўстойліва паўтаральных сюжэтаў, якія складаюцца ў агульную карціну размеркаванага, а не раўнамернага тэмпературнага дэфіцыту.

Зняволеныя апісваюць канкрэтныя атрады як сістэматычна больш халодныя, чым астатнія. Нераўнамернасць ацяплення ўспрымаецца не як выпадковасць, а як вядомая і абмяркоўваная ўнутры калектыву характарыстыка канкрэтных памяшканняў.

Неўцеплены дах называецца асобнай крыніцай праблемы: зімой праз яго ў памяшканнях халадней, улетку, наадварот, гарачэй, чым у астатняй частцы будынка. Такім чынам, адзін і той жа канструктыўны дэфект дзейнічае ў абодва бакі ў залежнасці ад сезона.

Батарэі апісваюцца як «ледзь цёплыя»: ацяпленне фармальна ёсць, але не забяспечвае дастатковай тэмпературы. Гэта структурна супадае з ужо апісанай у раздзеле пра вентыляцыю сітуацыяй, калі інфраструктура намінальна існуе, але не функцыянуе ў аб'ёме, дастатковым для заяўленай мэты.

Асобна фіксуецца скразняк у стыку паміж дзвярыма і акном — лакальны канструктыўны дэфект, які не ліквідуецца агульнымі мерамі па ацяпленні.

На гэтым фоне зняволеныя апісваюць адчыненыя ўначы вокны як парадаксальную, але вытлумачальную практыку. Яна паказвае на тое, што духата і недахоп вентыляцыі ў асобныя перыяды адчуваюцца мацней, чым холад. Размеркаванне цяпла ў будынку настолькі нераўнамернае, што ў адным і тым жа памяшканні ў розны час сутак або года дамінуе то адна, то другая праблема.

Нарэшце, эканомія на ацяпленні наўпрост называецца інфармантамі тлумачэннем таго, што адбываецца, — не тэхнічная няспраўнасць, а свядомае рашэнне аб абмежаванні расходу.

Адзін з інфармантаў апісвае рэзкі кантраст тэмпературных умоў на розных вытворчых участках адной і той жа ўстановы: на мылаварні і хлебапякарні вельмі горача, аж да таго, што работнікам даводзіцца выходзіць на вуліцу падыхаць; у цэхах з пастаянна адчыненымі варотамі для транспартавання матэрыялаў, напрыклад там, дзе працуюць з дрэвам, — наадварот, холадна.

Міжсезонне асобна называецца цяжкім перыядам, паколькі цёплае адзенне ў гэты час ужо не выдаюць, а працаваць на вуліцы па-ранейшаму даводзіцца. Гэтае апісанне паказвае, што тэмпературны дыскамфорт на вытворчасці не зводзіцца да аднаго полюса — толькі спёкі або толькі холаду, — а залежыць ад

канкрэтнага ўчастка і каляндарнага перыяду. Таму адзіная ацэнка ўмоў працы па ўсім прадпрыемстве некарэктная: неабходна разглядаць канкрэтныя цэхі і сезоны асобна.

Асвятленне

Асобны самастойны сюжэт — якасць асвятлення і яго ўплыў на зрок. Адзін з інфармантаў звязвае пагаршэнне зроку на адно вока, зніжэнне вастрыні з 1,0 да прыкладна 0,9, з працяглым знаходжаннем у месцах пазбаўлення волі — больш за сем месяцаў. Ён тлумачыць гэта дрэнным асвятленнем, пастаянным знаходжаннем у памяшканні пры абмежаваным доступе да прагулак і вымушанай адаптацыяй зроку да працы на блізкай адлегласці.

Інфармант асобна падкрэслівае, што гэтая праблема, паводле яго назіранняў, шырока распаўсюджана сярод зняволеных і не звязана з палітычным статусам. Такім чынам, яна апісваецца як наступства ўмоў утрымання як такіх, а не як форма выбарачнага ціску.

ПК-4: стан будынкаў па атрадах

Дэталёвае апісанне бытавых умоў па асобных атрадах змяшчаецца ў дакладзе Міжнароднага камітэта па расследаванні катаванняў у Беларусі «Катаванні і жорсткае абыходжанне ў гомельскай жаночай калоніі № 4»[24].

Атрад № 15 размяшчаецца ў ветхім будынку; душавая цалкам адсутнічае. На атрад колькасцю 80 чалавек прыпадаюць чатыры ракавіны, адзін таз для мыцця ног, пяць унітазаў на першым паверсе, адзін з якіх замацаваны за начальнікам атрада, гэта значыць фактычна чатыры ўнітазы на 80 жанчын, і адно бідэ.

Атрад № 16, нягледзячы на статус паказальнага і рэгулярныя наведванні правяраючых, адзначаецца сырасцю і цвіллю; старыя драўляныя аконныя рамы не захоўваюць цяпло, памяшканне для сушкі рэчаў адсутнічае.
У атрадзе № 14 рамонт доўгі час не праводзіўся: сцены і падлога пашкоджаныя, сантэхніка знаходзіцца ў стане карозіі.

Атрад № 13, размешчаны ў адносна новым і адрамантаваным корпусе, пакутуе ад няправільна ўсталяваных аконных канструкцый, якія ствараюць пастаянны скразняк. Паводле сведчанняў зняволеных, менавіта ў гэты атрад накіроўваюць у якасці пакарання, а зімой жанчыны спяць, накрыўшыся верхнім адзеннем паверх пасцельнай бялізны.

Былыя зняволеныя апісваюць тэмпературны рэжым у атрадах № 7, 9 і 17 як здавальняючы.

Насякомыя — плацяныя вошы, прусакі, павукі — фіксуюцца ў большасці атрадаў незалежна ад іх індывідуальнага стану, а недастатковае асвятленне асобна называецца фактарам, які ўскладняе элементарную гігіену.

24 https://legin.info/documents/44

ПК-1, Наваполацк: будынак каранціну і экалагічнае спагнанне

Тэрыторыя ПК-1 непасрэдна прымыкае да вытворчых аб'ектаў нафтахімічнага комплексу; рэктыфікацыйная калона завода «Нафтан» знаходзіцца на адлегласці каля аднаго кіламетра ад жылой зоны.

Расследаванне Праваабарончага цэнтра «Вясна» ад лютага 2024 года, заснаванае на сведчанні былога зняволенага, зафіксавала, што будынак, які выкарыстоўваўся для размяшчэння каранціну для тых, хто толькі прыбыў, знаходзіцца ў аварыйным стане. На другім паверсе таго ж будынка складуюцца будаўнічыя адходы пасля рамонтных работ на тэрыторыі ўстановы.

Тое ж расследаванне фіксуе, што прыродаахоўныя органы наклалі на ўстанову адміністрацыйнае спагнанне за спальванне адходаў. Такім чынам, дзяржава афіцыйна прызнала экалагічнае парушэнне на аб'екце, дзе палітычныя зняволеныя адбываюць пакаранне, але зафіксавала гэтае парушэнне як прыродаахоўнае, а не як умову ўтрымання людзей.

Узрост будынкаў і энергаэфектыўнасць: нацыянальны кантэкст

Паводле публічных заяў Дэпартамента па энергаэфектыўнасці Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Рэспублікі Беларусь, сучасныя энергаэфектыўныя шматкватэрныя жылыя дамы, пабудаваныя ў апошнія гады, маюць удзельнае цепласпажыванне на ацяпленне ў 2–4 разы ніжэйшае, чым будынкі папярэдніх дзесяцігоддзяў пабудовы. Павышэнне энергаэфектыўнасці жыллёвага фонду з'яўляецца адным з найважнейшых напрамкаў энергазберажэння ў краіне[25].

З 2012 года ў Беларусі рэалізуецца праект Праграмы развіцця ААН і Глабальнага экалагічнага фонду «Павышэнне энергетычнай эфектыўнасці жылых будынкаў у Рэспубліцы Беларусь». Мэтай праекта з'яўляецца скарачэнне спажывання цеплавой энергіі на ацяпленне і гарачае

25 https://energoeffect.gov.by/news/news_2022/20220614_news1

водазабеспячэнне да 60 кВт·г/м^2, што перавышае патрабаванні цеплавых нарматываў і будаўнічых норм, якія дзейнічалі на момант распрацоўкі праекта[26,27].

У межах праекта пабудаваныя пілотныя энергаэфектыўныя дамы ў Мінску, Гродне і Магілёве з наступным маніторынгам фактычнага энергаспажывання[28].

У дачыненні да будынкаў Дэпартамента выканання пакаранняў звестак пра рэалізацыю супастаўных праграм мадэрнізацыі няма. Там, дзе дзяржава мэтанакіравана інвестуе ў зніжэнне цепластрат і павышэнне энергаэфектыўнасці жыллёвага фонду, пенітэнцыярная інфраструктура застаецца па-за гэтай палітыкай, і адкрытых даных пра тое, ці распаўсюджваюцца на яе аналагічныя меры, не выяўлена.

Адсутнасць падобных праграм у дачыненні да беларускай пенітэнцыярнай сістэмы кантрастуе з міжнароднай практыкай, якая пашыраецца. У Ірландыі дзяржаўны мандат па кліматычных дзеяннях у дзяржаўным сектары наўпрост распаўсюджваецца на пенітэнцыярную службу: першая дарожная карта Ірландскай турэмнай службы ўстанаўлівае мэты па скарачэнні энергаспажывання і выкідаў, звязаных з выкапнёвым палівам. Пры гэтым сама служба публічна прызнае складанасць іх дасягнення менавіта з-за старога фонду будынкаў, першапачаткова спраектаваных без уліку экалагічных патрабаванняў. Гэтая сітуацыя структурна аналагічная апісанай у гэтай працы ў дачыненні да ПК-4 і ПК-1.

Пенітэнцыярная служба Паўночнай Ірландыі адкрыла ў 2024 годзе сонечную электрастанцыю на тэрыторыі турмы Хайдбанк. Папраўчая служба Канады з 1997 года публікуе ўласную стратэгію ўстойлівага развіцця і дасягнула скарачэння выкідаў парніковых газаў на 31,9 % з 2005 года.

Дэпартамент папраўчых установаў і рэабілітацыі Каліфорніі рэалізуе ўласную дарожную карту ўстойлівасці, якая ўключае пераход на аўтапарк з нулявым узроўнем выкідаў і праграмы энергаэфектыўнасці.

26 https://energoeffect.gov.by/effbuild/download/130.pdf
27 https://rep.bntu.by/items/337f72a5-8fb0-49a7-b8fc-93919efc878a
28 http://mas.gov.by/special/ru/news_ru/energoeffektivnost-o-chem-govorjat-pervye-dannye-monitoringa-trex-pilotnyx-domov-993/

У Вялікабрытаніі плануецца будаўніцтва чатырох новых турмаў з нулявым узроўнем выкідаў і цалкам электрычным энергазабеспячэннем; Шатландыя абвясціла пра будаўніцтва першай турмы на аднаўляльных крыніцах энергіі з выкарыстаннем геатэрмальных цеплавых помпаў. Індыйская турма Tihar у Нью-Дэлі з 2010 года эксплуатуе біягазавую ўстаноўку і сонечныя электрастанцыі.

Паказальна, што ніводзін з гэтых прыкладаў не адносіцца да краін з закрытай палітычнай сістэмай, супастаўнай з Беларуссю. Гэта робіць разрыў паміж афіцыйна дэкларованай кліматычнай палітыкай Беларусі і яе нераспаўсюджваннем на пенітэнцыярную сістэму яшчэ больш прыкметным на фоне таго, што нават у дэмакратычных дзяржавах менавіта турэмныя ведамствы нярэдка становяцца першапраходцамі энергаэфектыўнасці сярод дзяржаўных устаноў.

Тэмпературны дэфіцыт размеркаваны нераўнамерна паміж атрадамі і ўчасткамі вытворчасці, што задакументавана як вядомая ўнутры калектыву характарыстыка канкрэтных памяшканняў. Будынак каранціну ў ПК-1 задакументаваны як такі, што знаходзіцца ў аварыйным стане; на ўстанову было накладзена адміністрацыйнае спагнанне за спальванне адходаў. Нацыянальныя праграмы энергаэфектыўнасці жыллёвага фонду не распаўсюджваюцца на пенітэнцыярныя ўстановы.

5.6 Гатоўнасць да бедстваў і рэагаванне

Правілы ўнутранага распарадку папраўчых установ, пункт 81, устанаўліваюць, што ў непагадзь і пры нізкай тэмпературы праверкі наяўнасці асуджаных праводзяцца ў памяшканнях, а не на вуліцы.

Гэтая норма з'яўляецца адзіным выяўленым у беларускім заканадаўстве палажэннем, якое наўпрост рэгулюе абарону зняволеных ад неспрыяльных умоў надвор'я падчас абавязковых рэжымных працэдур.

Спецыяльнага нарматыву або пратакола, які рэгулюе дзеянні адміністрацыі папраўчых устаноў пры стыхійных бедствах — паводках, пажарах, экстрэмальнай спёцы — у дачыненні да бяспекі зняволеных у адкрытых крыніцах не выяўлена. Пастанова МНС Рэспублікі Беларусь № 82 ад 21.12.2021 устанаўлівае агульныя патрабаванні пажарнай бяспекі і парадак складання планаў эвакуацыі, аднак не ўтрымлівае спецыяльных палажэнняў для ўстаноў закрытага тыпу.

Непрымяненне нормы

Задакументаваныя ў інтэрв'ю выпадкі датычацца не адсутнасці нормы, а яе сістэматычнага непрымянення, прытым што сама норма наўпрост вядомая інфармантам і цытуецца імі даслоўна.

> *У правілах унутранага распарадку прапісана, што ў непагадзь, пры адмоўных тэмпературах, пры вельмі нізкіх тэмпературах праверкі праводзяцца ў будынку. Гэтае правіла ўвогуле не дзейнічала. Ці лівень, ці завіруха, ці град, ці снег, ці спёка, ці вельмі нізкая тэмпература — мы ўсе стаялі на вуліцы па 30 хвілін. Значыць, ну гэта таксама катаванне, то бок правілы ўнутранага распарадку пра тое, каб у непагадзь праверкі праводзіліся ў памяшканні, не дзейнічалі. А ў нас, як у тых, хто на прафуліку, было чатыры праверкі на дзень.*

Значыць, дождж — гэта яшчэ адзін такі вось жах, жахлівы жах. Вы ў сукенцы, у вас яшчэ няма гэтага, ну, ёсць дзяўчаты, у якіх ці дапамогі няма, ці яшчэ нешта такое, няма дажджавіка. І тут проста патокі вады льюцца з неба. Вы прамакаеце, ну, да ніткі, да ніткі. А гэтым летам, ну, халаднавата. І вось людзі стаяць раздзетыя пад гэтым жахлівым дажджом.

Інфармантка наўпрост кваліфікуе тое, што адбываецца, як парушэнне канкрэтнага палажэння Правіл унутранага распарадку, а не як агульную скаргу на надвор'е.

Важным з'яўляецца і ўказанне на частату: як асоба, якая стаяла на прафілактычным уліку, інфармантка праходзіла чатыры праверкі на дзень, гэта значыць у чатыры разы часцей падвяргалася ўздзеянню неспрыяльнага надвор'я, чым прадугледжана агульным распарадкам для астатніх зняволеных.

У прааналізаваных фрагментах па ПК-4 і ПК-1 звестак пра пратаколы рэагавання на паводкі, пажары або іншыя стыхійныя бедствы, якія выходзяць за межы штодзённага распарадку, гэта значыць пра меры на выпадак падзей, што патрабуюць эвакуацыі або экстраных дзеянняў, а не руцінных праверак у неспрыяльнае надвор'е, не выяўлена.

Адзіная выяўленая ў беларускім заканадаўстве норма, якая абараняе зняволеных ад неспрыяльнага надвор'я праз правядзенне праверак у памяшканні, задакументавана не прымянялася на практыцы, прытым што сама норма была вядомая інфармантам даслоўна. Спецыяльнага пратакола рэагавання на стыхійныя бедствы для месцаў пазбаўлення волі не выяўлена.

5.7 Успрыманне экалагічнай павесткі і «экалагічнае грамадзянства» (environmental citizenship)

Палітычная зняволеная Наста Лойка апісвае структуру месцаў пазбаўлення волі як аб'ектыўна нізкавугляродную: зняволеныя не карыстаюцца тэлефонамі, не лётаюць самалётамі, не спажываюць значнай колькасці электраэнергіі і вымушаныя доўгі час карыстацца абмежаваным наборам рэчаў.

Ліміты, якія дзейнічаюць у калоніі, — жорсткі пералік дазволенага адзення паводле колькасці адзінак, абмежаваная перыядычнасць перадач, ліміт на пакупкі ў краме ўстановы — аб'ектыўна зніжаюць спажыванне незалежна ад намераў зняволенага. Гэта можна кваліфікаваць як парадокс: інстытуцыйныя абмежаванні, уведзеныя не ў мэтах экалагічнай палітыкі, а як элемент рэжыму, ствараюць экалагічны эфект, супастаўны з добраахвотным нізкавугляродным ладам жыцця[29].

Інфармантка апісвае спробу захаваць шэраг экалагічных звычак, якія існавалі да зняволення, і трансфармацыю тых, якія захаваць не ўдалося. Шматразовыя штодзённыя пракладкі двойчы канфіскоўваліся адміністрацыяй і перадаваліся на склад захоўвання. Падчас менструацыі выкарыстанне аднаразовых сродкаў гігіены было аб'ектыўна вымушаным з-за адсутнасці пастаяннага доступу да ракавіны на працоўным месцы ў швейнай вытворчасці.

Шматразовыя штодзённыя пракладкі меншага памеру ўдалося захаваць і выкарыстоўваць дзякуючы спецыяльна абсталяваным сушылкам, прадугледжаным у атрадах. Драўляныя зубныя шчоткі з тэрмінам выкарыстання каля шасці месяцаў супраць трох месяцаў у пластыкавых замаўлялі мэтанакіравана, адзначаючы, што сярод іншых зняволеных гэтая практыка не пашырылася.

Інфармантка апісвае дзве спробы ініцыяваць змяненне інстытуцыйнай

29 https://news.zerkalo.io/life/128018.html

практыкі праз афіцыйныя каналы.

Першая датычылася арганізацыі раздзельнага збору адходаў. У сталовай існавала частковая сарціроўка — кардон і буйная пластыкавая тара, — аднак усё астатняе смецце вывозілася без падзелу, уключаючы значны аб'ём пластыкавых пакетаў пасля наведванняў крамы ўстановы.

Інфармантка разглядала магчымасць падачы фармальнай прапановы ў Дэпартамент выканання пакаранняў з пакрокавым апісаннем арганізацыі раздзельнага збору, але не рэалізавала гэты намер, адзначаючы адсутнасць рэальнай прасторы для падачы падобных ініцыятыў.

Другая спроба датычылася эканоміі вады: інфармантка спрабавала пераканаць іншых зняволеных закрываць кран падчас чысткі зубоў.

Даклад UNICRI/PRI Green Prisons наўпрост пацвярджае слушнасць апісаных вышэй практык. Экалагічная ўстойлівасць у турмах можа дасягацца менавіта праз простыя, малазатратныя меры на ўзроўні асобнага чалавека і ўстановы. У дакладзе асобна адзначаецца, што «азеляненне турмаў не абавязкова павінна быць дарагім або рэсурсаёмістым», а ўцягнутасць саміх зняволеных называецца істотным рэсурсам для паспяховай рэалізацыі такіх ініцыятыў.

Раздзельны збор адходаў, эканомія вады і шматразовыя сродкі гігіены аднесены ў дакладзе да дзейсных практык цыркулярнай эканомікі і рацыянальнага водакарыстання.

З іншага боку, той жа даклад наўпрост папярэджвае пра рызыку «грынвошынгу» — практыкі, пры якой экалагічная рыторыка і сертыфікацыя выкарыстоўваюцца для маскіроўкі парушэнняў правоў чалавека, уключаючы прымусовую працу, несправядлівую аплату і жорсткае абыходжанне.

Даклад таксама наўпрост прыводзіць Беларусь як прыклад: міжнародны орган лясной сертыфікацыі FSC гадамі выдаваў сертыфікаты ўстойлівасці на драўняную прадукцыю з беларускіх папраўчых калоній, выраблену з выкарыстаннем працы палітычных зняволеных, уключаючы калонію № 2 у Бабруйску, дзе адбывалі пакаранне палітычныя зняволеныя, задакументаваныя ў адкрытых крыніцах. Частка сертыфікатаў была выдадзена ўжо пасля таго, як катаванні затрыманых атрымалі міжнародны розгалас[30].

30 https://unicri.org/sites/default/files/2025-03/Guide-Green-Prisons-Mar-2025.pdf

6 Высновы і юрыдычная кваліфікацыя

Высновы

Гэтая праца задакументавала і супаставіла з нацыянальнымі і міжнароднымі нормамі ўмовы ўтрымання ў дзвюх папраўчых калоніях Беларусі — ПК-4 у Гомелі і ПК-1 у Наваполацку.

Па кожным з прааналізаваных напрамкаў — паветра, санітарыя, вада, здароўе, інфраструктура, гатоўнасць да бедстваў — выяўлена разыходжанне адначасова на трох узроўнях: міжнародны стандарт задае колькасны мінімум; нацыянальнае заканадаўства альбо ўвогуле не ўстанаўлівае колькаснага нарматыву, альбо ўстанаўлівае яго на ўзроўні міжнароднага мінімуму ці ніжэй; фактычная практыка сістэматычна адхіляецца ад абодвух узроўняў у горшы бок.

Санітарная інфраструктура абедзвюх устаноў не забяспечвае фізічнай магчымасці выконваць гігіену ў аб'ёме, патрабаваным Правіламі Нэльсана Мандэлы. У ПК-4 на атрад колькасцю 97–100 чалавек прыпадае адна душавая кабіна з доступам на працягу 30 хвілін у суткі. Пры такой прапускной здольнасці фактычны інтэрвал паміж мыццём для большасці зняволеных складае два-тры тыдні, гэта значыць у два-тры разы перавышае міжнародны мінімум у адно мыццё на тыдзень.

Чарговасць доступу да санітарных прыбораў кантралюецца не адміністрацыяй непасрэдна, а актывам атрада, што ператварае базавую фізіялагічную патрэбу ў інструмент унутрыатраднай іерархіі.

Якасць паветра ў жылых памяшканнях вызначаецца не станам інжынерных сістэм, а вымушаным выбарам зняволеных паміж прытокам паветра і захаваннем цяпла: механічная вентыляцыя адсутнічае, натуральная выводзіцца з працы самімі зняволенымі дзеля абароны ад холаду. Установе гэта было вядома або магло быць устаноўлена падчас любога агляду.

На вытворчасці сістэматычна парушаюцца патрабаванні санітарных норм да мясцовай выцяжной вентыляцыі, што незалежна пацвярджаецца ў некалькіх брыгадах.

Пітная вада на вытворчасці ў адной з дзвюх установ не вылучана як асобная катэгорыя і замяняецца вадой з умывальніка; у другой адзіная кропка водазабору размешчана непасрэдна каля санітарнага вузла. У абодвух выпадках фактычная магчымасць наталіць смагу вызначаецца распарадкам, устаноўленым адміністрацыяй, а не наяўнасцю вады як такой.

Якасць пітной вады ў цэнтралізаванай сетцы Гомеля задакументавана не адпавядае гігіенічным нарматывам паводле ўтрымання жалеза і каламутнасці на працягу як мінімум двух гадоў, з гістарычным максімумам перавышэння ў I квартале 2026 года; санітарная служба горада наўпрост звязвае гэта са станам водаправодных сетак.

Будынак, які выкарыстоўваўся для каранціну для тых, хто толькі прыбыў у ПК-1, задакументавана знаходзіцца ў аварыйным стане. На ўстанову было накладзена адміністрацыйнае спагнанне за спальванне адходаў. Тэрыторыя ПК-1 непасрэдна прымыкае да нафтахімічнага комплексу «Нафтан».

Норма аб правядзенні праверак наяўнасці асуджаных у памяшканні пры непагадзі і нізкіх тэмпературах, устаноўленая пунктам 81 Правіл унутранага распарадку папраўчых устаноў, сістэматычна не прымянялася на практыцы, прытым што змест нормы быў наўпрост вядомы інфармантам.

Спецыяльнага пратакола рэагавання на стыхійныя бедствы ў дачыненні да бяспекі зняволеных у беларускім заканадаўстве не выяўлена.

Доступ да медыцынскай дапамогі не блакуецца прамой адмовай, а абмяжоўваецца сістэмай працэдурных фільтраў: абясцэньваннем скаргі, прывязкай рашэння лекара да рэакцыі прысутнага супрацоўніка адміністрацыі, затрымкай рэакцыі да наступлення крытычнага стану.

Паводле даных Праваабарончага цэнтра «Вясна», на жнівень 2026 года сярод 863 палітычных зняволеных у 266 задакументаваныя сур'ёзныя праблемы са здароўем.

Тэхнічны нарматыў ТКП 310-2011, які рэгулюе канструктыўныя параметры

будынкаў следчых ізалятараў і турмаў і на які адміністрацыя наўпрост спасылаецца як на падставу канкрэтных практык, фізічна недаступны ў электронных базах прававой інфармацыі і ва ўсіх праверaных навукова-тэхнічных бібліятэках краіны, уключаючы рэспубліканскую.

Пастанова Міністэрства аховы здароўя № 95, якая раней устанаўлівала адзіны колькасны нарматыў тэмпературы паветра ў жылых памяшканнях +18… +24 °C, страціла сілу з траўня 2026 года без замены. З гэтага моманту ў Беларусі не дзейнічае ніводзін колькасны нарматыў тэмпературы, прымяняльны нават да звычайных жылых дамоў, не кажучы ўжо пра месцы пазбаўлення волі.

Юрыдычная кваліфікацыя

Устаноўленыя факты ўтвараюць парушэнне правоў, гарантаваных артыкулам 10 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах — права на гуманнае абыходжанне, — а таксама артыкуламі 11–12 Міжнароднага пакта аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах — права на дастатковы жыццёвы ўзровень і найвышэйшы дасяжны ўзровень здароўя.

Устаноўленыя ўмовы таксама не адпавядаюць Правілам 13–19 Правілаў Нэльсана Мандэлы, якія рэгулююць матэрыяльныя ўмовы ўтрымання і санітарыю, Правілам 15–16 у частцы гігіены і Правілу 22 у частцы доступу да пітной вады.

Супадзенне выяўленых заканамернасцяў у дзвюх структурна розных установах — жаночай калоніі ў Гомелі і мужчынскай у Наваполацку, якія адрозніваюцца па геаграфіі, клімаце і прамысловым асяроддзі, — выключае тлумачэнне ўстаноўленых фактаў выпадковымі лакальнымі абставінамі.

Недаступнасць тэхнічнага нарматыву, на які адміністрацыя спасылаецца як на прававую падставу канкрэтных абмежавальных практык, і адмена дзейнага тэмпературнага нарматыву без замены ўяўляюць сабой самастойнае парушэнне прынцыпу прававой пэўнасці незалежна ад зместу фактычных умоў утрымання.

Значэнне для міжнародных механізмаў

Задакументаваныя абставіны падпадаюць пад мандат Спецыяльнага дакладчыка па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі, Камітэта супраць катаванняў і Групы незалежных экспертаў ААН па Беларусі.

Устаноўлены факт датычнасці міжнароднага бізнесу да ланцугоў паставак, звязаных з працай зняволеных у беларускіх папраўчых калоніях, уключаючы выпадкі сертыфікацыі такой прадукцыі як экалагічна ўстойлівай, стварае падставы для прымянення Кіруючых прынцыпаў ААН у сферы бізнесу і правоў чалавека (UN Guiding Principles on Business and Human Rights) да адпаведных карпаратыўных суб'ектаў.

Абмежаванні гэтага дакумента

Праца не можа ўстанавіць дакладнае паходжанне зафіксаваных перавышэнняў паказчыкаў якасці вады непасрэдна на тэрыторыі калоній, у адрозненне ад гарадской сеткі ў цэлым, і не можа незалежна праверыць змест недаступных тэхнічных нарматываў.

Гэтае абмежаванне з'яўляецца прамым наступствам інстытуцыйнай непразрыстасці пенітэнцыярнай сістэмы Беларусі, а не метадалагічным недахопам гэтага даследавання.

7 Рэкамендацыі

Органам Рэспублікі Беларусь

- забяспечыць публічны доступ да тэхнічных нарматываў, якія рэгулююць канструктыўныя параметры месцаў пазбаўлення волі;

- устанавіць колькасныя нарматывы па расходзе вады, частаце мыцця і плошчы санітарных памяшканняў на чалавека ў дачыненні да ўстаноў крымінальна-выканаўчай сістэмы і прывесці іх у адпаведнасць з міжнароднымі стандартамі.

Механізмам ААН

- улічваць задакументаваныя ў гэтай працы даныя пры падрыхтоўцы дакладаў Спецыяльнага дакладчыка па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі і Камітэта супраць катаванняў;

- разгледзець магчымасць уключэння пытання аб экалагічных умовах утрымання палітычных зняволеных у пералік тэм будучых запытаў інфармацыі (call for input);

- спрыяць правядзенню незалежнай ацэнкі адпаведнасці беларускіх пенітэнцыярных устаноў Правілам Нэльсана Мандэлы, уключаючы забеспячэнне доступу да тэхнічных нарматываў, якія рэгулююць адпаведныя аб'екты.

8 Напрамкі далейшых даследаванняў

Далейшая праца магла б уключаць незалежнае геапрасторавае картаграфаванне пенітэнцыярных устаноў Беларусі адносна зон прамысловага і радыеактыўнага забруджвання; сістэматычнае кадаванне корпуса інтэрв'ю па тэме харчовага забеспячэння і яго залежнасці ад кліматычных фактараў; пашырэнне параўнальнага матэрыялу за кошт дадатковых устаноў для праверкі ўстойлівасці выяўленых мадэляў дыферэнцыяцыі паводле палітычнага статусу; а таксама наступны маніторынг прымянення задакументаваных практык пасля магчымых змяненняў у заканадаўстве або правапрымяненні.

Дадатак
Агляд літаратуры і міжнародны кантэкст

Экалагічнае вымярэнне месцаў пазбаўлення волі стала прадметам сістэматычнай акадэмічнай і праваабарончай увагі параўнальна нядаўна. Паказальным з'яўляецца само з'яўленне спецыяльнага тэрміна prison ecology — напрамку, які дакументуе сувязь турмаў, следчых ізалятараў і экалагічных умоў. Акадэмічнае асэнсаванне тэмы даганяе актывісцкую практыку толькі ў апошняе дзесяцігоддзе[31,32].

Найбольш развіты і метадалагічна прапрацаваны масіў даследаванняў сабраны ў дачыненні да ЗША. Гэта звязана не з тым, што краіна рэпрэзентатыўная для глабальнай сітуацыі, а з тым, што даступнасць судовых матэрыялаў і наяўнасць актыўнай сеткі праваабарончых арганізацый зрабілі магчымым падрабязнае дакументаванне праблемы.

Інстытуцыйнае прызнанне праблемы адбываецца і за межамі ЗША. У Вялікабрытаніі кааліцыя больш за 80 сацыяльных і экалагічных дабрачынных арганізацый у межах праграмы Everyone's Environment зафіксавала, што зняволеныя сутыкаюцца з павышанай рызыкай смяротнасці, псіхічных расстройстваў, гвалту і змены структуры захворвальнасці на фоне хваль спёкі і паводак. З-за размяшчэння шэрагу ўстаноў зняволеныя дадаткова падвяргаюцца павышаным рызыкам для здароўя, звязаным з забруджваннем паветра, а доступ да зялёных і водных прастораў на тэрыторыі брытанскіх турмаў у цэлым адсутнічае[33].

Паказальна, што і ў гэтым кантэксце — у краіне з непараўнальна больш высокім узроўнем інстытуцыйнай празрыстасці, чым у Беларусі, — аўтары

31 https://onlinelibrary.wiley.com/doi/abs/10.1111/anti.12569
32 https://escholarship.org/content/qt5848d17m/qt5848d17m.pdf
33 https://npproduction.wpenginepowered.com/wp-content/uploads/2024/12/NPC-Everyones-Environment-People-in-Prisons.pdf

даклада адзначаюць адсутнасць нацыянальнай стратэгіі, якая забяспечвала б зняволеным доступ да «зялёных» працоўных месцаў, і ўказваюць на неабходнасць узгодненых мінімальных стандартаў ацяплення і ахалоджвання менавіта для пазбягання рызыкі «грынвошынгу»: павярхоўных экалагічных змяненняў без рэальнага паляпшэння ўмоў.

Гэта пацвярджае агульны тэзіс гэтай працы на матэрыяле краіны з палітычным рэжымам, супрацьлеглым беларускаму: нават там, дзе дзяржава афіцыйна прызнае праблему, інстытуцыйны адказ, суразмерны яе маштабу, не ўзнікае аўтаматычна.

Інфраструктурная ўразлівасць і тэмпературныя экстрэмумы

Даследаванні ў ЗША адзначаюць, што тэмпература ў турмах, не абсталяваных кандыцыянаваннем, рэгулярна дасягае значэнняў, здольных выклікаць цеплавое знясіленне і цеплавы ўдар. Даследчыкі звяртаюць увагу на структурную асаблівасць: кліматычныя пагрозы — экстрэмальная спёка, паводкі, ураганы і лясныя пажары — асабліва небяспечныя менавіта для зняволеных, паколькі яны практычна не маюць кантролю над уласным асяроддзем[34,35].

Напрыклад, паводле даных дзяржаўнай гідраметэаралагічнай службы Рэспублікі Беларусь, перыяд з 2020 па 2026 год стаў у краіне чарадой кліматычных рэкордаў, а 2024 год аказаўся самым цёплым за ўсю гісторыю метэаназіранняў: сярэднегадавая тэмпература склала +9,5 °C[36].

Калі для звычайнага жыхара Беларусі такая спёка была нязручнасцю, з якой можна было справіцца — адчыніць акно, сысці ў цень, купіць ваду, скараціць час знаходжання на вуліцы, — у зняволенага следчага ізалятара такой магчымасці магло не быць увогуле: акно фізічна заблакавана глухой рашоткай, а доступ да вады абмяжоўваецца адміністрацыяй.

Іншымі словамі, адзін і той жа кліматычны стрэсар для грамадзянскага насельніцтва быў непрыемнасцю, тады як для зняволенага ў апісаных умовах станавіўся формай катавання.

---

34 https://www.vera.org/news/prison-is-already-hell-and-climate-change-is-making-it-worse
35 https://www.colorado.edu/asmagazine/2026/09/01/climate-crisis-behind-bars-heating
36 https://belgidromet.by/ru/climatolog-ru/view/klimaticheskaja-xarakteristika-2025-goda-11591-2026/

Забруджванне, размяшчэнне аб'ектаў і якасць вады і паветра

Праблемы якасці вады сістэмна задакументаваныя ў даследаваннях пенітэнцыярных устаноў ЗША. У адной з турмаў Масачусэтса вада на працягу многіх гадоў мела цёмны колер і павышаны ўзровень марганцу; турма ў Тэхасе на працягу дзесяцігоддзя забяспечвалася вадой з павышаным узроўнем мыш'яку; успышкі хваробы легіянераў фіксаваліся ў турмах Каліфорніі, Ілінойса і Нью-Ёрка. У Канэктыкуце суд у 2018 годзе прызнаў шматгадовае ўздзеянне радону на зняволеных «свядомым і безразважным»[37].

Для Беларусі таксама важная геаграфія размяшчэння калоній, дзе ўтрымліваюцца палітычныя зняволеныя. У прыватнасці, Гомель раней афіцыйна адносіўся да зоны радыеактыўнага забруджвання і быў выведзены з пераліку зон радыеактыўнага забруджвання пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 3 жніўня 2026 года.

Афіцыйныя дадзеныя дзяржаўнага маніторынгу атмасфернага паветра Мінпрыроды Рэспублікі Беларусь за 2005–2025 гады пацвярджаюць статус Наваполацка, дзе знаходзіцца ПК-1, як аднаго з найбольш забруджаных гарадоў краіны.

Гатоўнасць да бедстваў і рэагаванне

Ураганы Харві, Катрына і Іда выявілі сістэмныя прабелы ў планах эвакуацыі месцаў пазбаўлення волі. Паводле дадзеных праваабарончых арганізацый, зняволеныя ў Луізіяне заставаліся ў будынках, якія затаплялiся, без сувязі з блізкімі нават ва ўмовах абвешчанай эвакуацыі грамадзянскага насельніцтва[38].

Гэты міжнародны досвед мае значэнне і для беларускага кантэксту, дзе ў адкрытых крыніцах не выяўлены нарматыўны дакумент, які ўтрымліваў бы спецыяльныя палажэнні аб рэагаванні на стыхійныя бедствы для ўстаноў закрытага тыпу.

37 https://www.prisonpolicy.org/blog/2022/04/20/environmental_injustice/
38 https://www.vera.org/news/prison-is-already-hell-and-climate-change-is-making-it-worse

Тэарэтычная інтэграцыя: environmental justice і carceral studies

Турмы можна разглядаць як прасторы экалагічнай несправядлівасці: месцы ўтварэння небяспечных адходаў, каналізацыйных скідаў і забруджвання паветра.

Адну з найбольш сістэматычных тэарэтычных інтэграцый гэтага тэзіса прапанаваў Дэвід Пэлоў. Яго канцэпцыя critical environmental justice наўпрост уключае пенітэнцыярную сістэму як аб'ект аналізу[39].

Гэты напрамак развіваецца і ў наступных працах, якія разглядаюць здароўе зняволеных, экалагічную справядлівасць і ўладкаванне пенітэнцыярных устаноў як узаемазвязаныя пытанні[40,41].

Глабальны скапінг-агляд (scoping review) даследаванняў пра ўплыў змянення клімату на здароўе людзей, якія знаходзяцца ў месцах пазбаўлення волі, таксама паказвае, што гэтая галіна застаецца недастаткова распрацаванай і характарызуецца істотнымі прабеламі ў эмпірычных дадзеных[42].

39 https://onlinelibrary.wiley.com/doi/abs/10.1111/anti.12569
40 https://www.tandfonline.com/doi/full/10.1080/10455752.2022.2141430
41 https://escholarship.org/content/qt5848d17m/qt5848d17m.pdf
42 https://www.emerald.com/ijoph/article/doi/10.1108/IJOPH-11-2025-0090/1346778

Міжнародны камітэт па расследаванні катаванняў у Беларусі

2026